№№151–152
(2879–2880)

9 кастрычніка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ЧУЛІ?

Дзмітрый Паўлічэнка адхілены ад пасады

Распараджэннем міністра ўнутраных спраў Беларусі Уладзіміра Навумава скандальна вядомы палкоўнік Дзмітрый Паўлічэнка адхілены ад пасады камандзіра 3-й брыгады спецыяльнага прызначэння ўнутраных войск МУС (в/ч 3214, Уручча, Мінск). Тым жа распараджэннем Паўлічэнка пераведзены ў распараджэнне камандуючага Унутранымі войскамі МУС.

Гэтае кадравае перасоўванне афіцыйна пацвердзілі ў прэс-службе ўнутраных войск, але ад якіх-небудзь каментарыяў адмовіліся. Не сталі каменціраваць абставіны гэтага нечаканага рашэння і ў прэс-службе МУС.

Затое дакладная вядома, што новым камандзірам брыгады спецназа стаў (і ўжо прадстаўлены асабістаму складу) палкоўнік Юрый Хаджымуратавіч Караеў. Гэта таксама нечаканае рашэнне, бо зусім нядаўна — у канцы ліпеня гэтага года — Караеў быў прызначаны камандаваць палком міліцыі спецыяльнага прызначэння (былы АМАП) ГУУС Мінгарвыканкама. І яшчэ адзін цікавы момант: раней Юрый Караеў служыў у спецназе ўнутраных войск якраз пад камандаваннем Дзмітрыя Паўлічэнкі.

Цяперашні кар'ерны кульбіт Паўлічэнкі — падстава ўспомніць, чым "праславіўся" чалавек, які доўгі час камандаваў так званым атрадам хуткага рэагавання, які неафіцыйна называлі "гвардыяй Лукашэнкі".

У 1999—2000 гадах у Беларусі зніклі першы віцэ-спікер Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Віктар Ганчар, бізнесмен і грамадскі дзеяч Анатоль Красоўскі, экс-міністр унутраных спраў, які пасля стаў апазіцыйным палітыкам, Юры Захаранка і аператар ГРТ Зміцер Завадскі. Па гэты дзень пра лёс гэтых людзей нічога не вядома. Следства нібыта доўжыцца, але без якога-небудзь прыкметнага выніку.

Аднак з-за падазрэнняў у дачыненні да выкраданняў і забойстваў апазіцыянераў уезд у краіны Еўрасаюза і ЗША забаронены для шэрагу высокапастаўленых беларускіх службоўцаў, у тым ліку — для Дзмітрыя Паўлічэнкі. Ён быў арыштаваны па падазрэнні ў здзяйсненні злачынстваў, звязаных з выкраданнем людзей, потым адпушчаны для "новых подзвігаў". Менавіта пад асабістым кіраўніцтвам Паўлічэнкі адбываўся разгон большасці мірных акцый у Мінску.

У 2005 годзе Аляксандр Лукашэнка асабіста ўзнагародзіў Паўлічэнку ордэнам "За службу Радзіме III ступені". Высокая ўзнагарода была дадзеная, як сказана ва ўказе, "за высокія паказчыкі ў службова-баявой дзейнасці, мужнасць і адвагу пры выкананні ваеннага абавязку". А роўна за год да таго Дзмітрый Паўлічэнка атрымаў іншую ўзнагароду з рук мітрапаліта Філарэта. Руская праваслаўная царква прадставіла яго да ордэна Роўнаапостальнага князя Уладзіміра. Гэтае рашэнне было агучана праз тры дні пасля таго, як улады Грэцыі адмовіліся ўпусціць на тэрыторыю сваёй краіны Юрыя Сівакова, якога таксама падазраюць у дачыненні да "эскадронаў смерці": якраз тады кіраўніцтва ўсіх еўрапейскіх краін прызнала сапраўднымі сабраныя камісіяй ПАСЕ доказы аб іх дачыненні да знікненняў людзей у Беларусі.

Былы кандыдат у прэзідэнты і палітвязень Аляксандр Казулін лічыць, што цяперашнюю адстаўку камандзіра спецназа Унутраных войск Дзмітрыя Паўлічэнкі "не трэба перабольшваць": *"Не выключана, што Паўлічэнку знялі, толькі каб паслаць пэўныя сігналы Захаду, нібыта ў Беларусі адбываюцца станоўчыя змены... Такія людзі, як Шэйман ды Паўлічэнка, нікуды не знікаюць. Варта дачакацца таго, як яны з'явяцца на новых пасадах"*.

Тут трэба нагадаць, што ў 2006 годзе Паўлічэнка асабіста збіваў кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна, які спрабаваў прайсці на Беларускі Усенародны сход.

Віктар ДЗЯМІДАЎ.



БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

Палкоўнік Паўлічэнка Дзмітрый Валер'евіч

Нарадзіўся ў 1966 годзе ў Віцебску. Пасля 8 класаў сярэдняй школы паступіў у Мінскае сувораўскае вучылішча. Скончыўшы яго ў 1983 годзе, стаў курсантам Мінскага вышэйшага ваенна-палітычнага агульнавайскавога вучылішча. У 1987 годзе атрымаў вышэйшую адукацыю і званне лейтэнанта, служыў на розных афіцэрскіх пасадах ва Узброеных Сілах СССР.

У 1991 годзе быў звольнены з войска па скарачэнні. Уладкаваўся працоўным на дрэваапрацоўчае прадпрыемства. Затым працаваў трэнерам па рукапашным боі і атлетычнай гімнастыцы ў дзіцяча-юнацкім спартыўным клубе.

У 1994 годзе паступіў на службу ў Асобны батальён спецыяльнага прызначэння Унутраных войск МУС Беларусі на пасаду камандзіра ўзвода спецыяльнага прызначэння. Праз нядоўгі час быў прызначаны камандзірам роты. 30 чэрвеня 1995 года паспяхова прайшоў кваліфікацыйныя выпрабаванні на права нашэння крапавага берэта. Затым быў абраны старшынёй Савета крапавых берэтаў Унутраных войск. Пасля службы ў Галоўным упраўленні камандуючага Унутранымі войскамі МУС Беларусі на пасадзе начальніка Службы падрыхтоўкі падраздзяленняў спецыяльнага прызначэння.

У лістападзе 1999 года па ягонай ініцыятыве ва Унутраных войсках на прафесійнай аснове быў створаны спецыяльны атрад хуткага рэагавання (СОБР). Паўлічэнка стаў яго камандзірам. Ужо праз некалькі месяцаў Дзмітрыю Паўлічэнка пайшоў на павышэнне: быў прызначаны на пасаду камандзіра 3-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння Унутраных войск МУС Беларусі, у якой і служыў да цяперашняга адхілення ад пасады.

Узнагароджаны баявым ордэнам "За асабістую мужнасць" за ўдзел у абяшкоджванні асоба небяспечнай узброенай банды. Мае некалькі медалёў. Жанаты (жонка служыць у той жа брыгадзе на пасадзе фельчара медыцынскай службы), мае дачку і сына.

АКЦЫЯ

Два маршруты «Дзядоў»

У аўторак старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі і ягоны намеснік Віктар Івашкевіч падалі заяўку ў гарвыканкам аб правядзенні традыцыйнага жалобнага шэсця на "Дзяды".

Гэтым разам акцыя пройдзе, калі ўлады дазволяць, 2 лістапада (нядзеля) а 12.00 ад Усходніх могілак. Удзельнікі шэсця спачатку ўскладуць кветкі да магіл Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Генадзя Карпенкі, Міхася Ткачова, Пімена Панчанкі і іншых. Пасля гэтага людзі скіруюцца вуліцай Каліноўскага і Лагойскім трактам да Курапатаў.

Паводле слоў Лявона Баршчэўскага, існавала папярэдняя дамова з лідэрам КХП—БНФ Зянонам Пазьняком, што ўдзельнікі "Дзядоў" пройдуць тым самым маршрутам, што і 20 гадоў таму. Аднак у апошні момант Пазьняк пасля настойвання "мінскіх калег" выказаўся за маршрут апошніх гадоў, гэта значыць ад гадзіннікавага завода, што на Талбухіна, да Курапатаў.

Лявон Баршчэўскі, аднак, выказаў спадзяванне, што дзве калоны ўсё ж змогуць злучыцца. "Памяць нельга дзяліць, асабліва між аднадумцамі", — сказаў паэт Генадзь Бураўкін.

АФІЦЫЙНА

Міністры замежных спраў Еўрасаюза выказалі жаданне сустрэцца з Сяргеем Мартынавым

Міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў запрошаны ўзяць удзел у пасяджэнні міністраў замежных спраў 27 краін Еўрасаюза, якое пройдзе 13 кастрычніка ў Люксембургу.

Як паведамляе AFP са спасылкай на прэс-сакратара вярхоўнага камісара ЕС Хаўера Саланы Крысціну Галах, 3 кастрычніка адбылася тэлефонная размова Х.Саланы і С.Мартынава. Паводле яе слоў, вярхоўны камісар запрасіў кіраўніка МЗС Беларусі ўзяць удзел у пасяджэнні.

Нагадаем, аб падобным запрашэнні прадстаўнікі еўраструктур заяўлялі яшчэ да парламенцкіх выбараў. Першапачаткова абмяркоўвалася магчымасць запрашэння Сяргея Мартынава 15 верасня для правядзення ў Бруселі перамоў з "тройкай" ЕС -- еўракамісарам па знешніх сувязях і палітыцы добрасуседства Бенітай Ферэра-Вальднер, кіраўніком МЗС Францыі Бернарам Кушнерам і вярхоўным прадстаўніком ЕС па агульнай знешняй палітыцы і бяспецы Хаўерам Саланам. Аднак потым было вырашана запрасіць кіраўніка МЗС Беларусі пасля парламенцкіх выбараў.

Марына РАХЛЕЙ.

БЕЛАРУСЬ—РОССИЯ

Путин и Сидорский пытались договориться в Заславле

Этой встречи в Беларуси ждали с особым нетерпением. Путин, с одной стороны, и Лукашенко с Сидорским — с другой, должны были решить ряд принципиально важных вопросов. А именно: о российском кредите, о цене на газ, о единой валюте, о признании Беларусью независимости Южной Осетии и Абхазии, о собственности Союзного государства, о размещении систем ПРО России в Беларуси.

Накануне визита Путина в Минск посол России в Беларуси Александр Суриков припугнул: главными, мол, на переговорах станут вопросы поставок в Беларусь российского газа и его цены. Он сказал, что по грубому подсчету Беларусь должна будет в следующем году платить за газ 250 долларов за тысячу кубометров. Наш бюджет рассчитан из того, что газ будет стоить 140 долларов. Почувствуйте, как говорится, разницу! И, соответственно, цену вопроса.

Визит начался с удивительно короткой встречи Владимира Путина и Александра Лукашенко. Причем Владимир Владимирович опоздал на два часа. Но Александр Григорьевич ждал.

Перед телекамерами российский премьер демонстративно говорил только об экономике, а белорусский президент — о политике. Достаточно сравнить цитаты:

Лукашенко: *"Кое-кто в СМИ стал намекать на то, что Беларусь якобы начинает торговаться с Западом. Я уже говорил представителям Запада и говорю сейчас вам: мы никогда дружбой с русскими не торговали и не будем торговать. [...] Необходим дополнительный импульс в наших союзных отношениях"*.

Путин: *"Чего ждут наши граждане? Уверенной и последовательной, грамотной экономической политики. [...] Россия готова рассмотреть предложения по углублению сотрудничества, поддержке белорусской финансовой системы. [...] Правильным будет сконцентрировать административные и финансовые ресурсы на наиболее перспективных проектах. Хотелось бы, чтобы это были, прежде всего, проекты в сфере высоких технологий"*.

Все дальнейшие переговоры шли уже непосредственно между Путиным и Сидорским с активным участием ответственных министров с обеих сторон. Россияне прилетели в Минск внушительным составом — Владимира Путина сопровождали первый вице-премьер Игорь Шувалов (он, кстати, задержался в Беларуси и на день "махнул" в Брест), вице-премьер, министр финансов Алексей Кудрин, министр энергетики Сергей Шматко, директор ФСБ Александр Бортников, а также представители практически всех крупных российских компаний.

Но результат минских переговоров оказался каким-то странным...

Цены на газ

О цене на газ на 2009 год белорусский и российский премьеры так и не договорились: оставили проблему Высшему госсовету — традиционной встрече президентов в конце года. Так называемые *"источники в российской делегации"* сообщили российским журналистам, что Россия берет на себя обязательства *"поставить в Беларусь газ в ранее оговоренном объеме и на ранее оговоренных условиях"*. Напомним, что формула цены на газ была согласована с белорусским руководством еще в декабре 2006-го и предусматривает поэтапное повышение. В 2008 году цена составляет 67% от рыночной, в 2009-м — 80%, в 2010-м — 90%, к 2011 г. — году президентских выборов — Беларусь должна покупать газ по мировой цене.

Как мы уже не однажды рассказывали, белорусская сторона добивается пересмотра этих договоренностей. В частности, мы посчитали бюджет исходя из того, что газ будет стоить 140 долларов. Россияне пока не отступают.

Высказывается версия, что нынешние переговоры по цене на газ не дали конкретных результатов по одной простой причине. Сейчас цена на нефть (к ней "привязана" цена газа) падает, и уже через полгода нынешняя цена на газ для Беларуси может оказаться завышенной. Однако такие суждения — откровенная глупость: если Россия смогла просчитать цену газа для Германии, то уж 80% от этой суммы вычислить точно могла. Не надо сомневаться: газовый вопрос остался покрытым туманом именно по политическим причинам.

Единая валюта

Тут тон сразу задал Путин, заявивший, что Москва (не снимая с повестки дня вопрос о единой валюте) на данном этапе предлагает создать валютный пул. Прозвучало это так: *"Хотел бы отметить заинтересованность в дальнейшем углублении валютной интеграции, в том числе посредством создания валютного пула и расширения использования российского рубля во взаимных расчетах. [...] Непонятно, почему мы с вами, реализуя крупные проекты в сфере энергетики, до сих пор производим расчеты между собой в долларах США, а между тем проблемы, с которыми сталкивается сегодня американская экономика, нам хорошо известны. [...] Будет вполне обоснованно, если подумаем над тем, что я сказал. Для российской национальной валюты это важно, да и с повестки дня мы все-таки не снимаем вопрос о создании единой валюты в какой-то исторической перспективе"*.

То есть Россия надеется на то, что расчеты между российскими и белорусскими компаниями будут вестись в российских рублях. Об этом больше всего говорил замглавы Минэкономразвития России Андрей Клепач. По его мнению, сейчас для России главное — не переход к единому эмиссионному центру, а установление для Беларуси российского рубля как резервной валюты. Цитата: *"Необходимы меры, которые расширят использование рубля в расчетах между российскими и белорусскими предприятиями. В этом смысле рубль становился бы резервной валютой для белорусской экономики, и Национальный банк накапливал бы резервы в рублях, как в евро и в долларах"*.

Российский кредит

Еще за неделю до визита россиян глава Минфина Беларуси Андрей Харковец подтвердил желание страны получить стаб-кредит в размере 2 млрд долларов на тех же условиях, которые были в 2007 году (то есть на 15 лет с отсрочкой платежа на пять лет и по минимальной ставке). Эти средства планируется направить на поддержку белорусской экономики и на покрытие разрывов в платежном балансе.

Однако буквально накануне визита в российском Минфине отказались подтвердить, что соглашение о кредите будет подписано 6 октября. Журналистам сказали: *"Речь о двух миллиардах уже не идет, сумма может быть ниже"*. Также в Минфине скептически восприняли желание белорусской стороны получить кредит на условиях 2007 года.

Правда, перед встречей премьеров уже белорусская сторона начала делать вид, что *"не очень-то и хотелось"*. Андрей Харковец заявил, что российский кредит запрашивается Беларусью вовсе не для покрытия дефицита бюджета. Он, дескать, необходим больше как *"подушка безопасности"* для экономики Беларуси на фоне кризисных тенденций в мировом финансовом секторе.

Между тем сегодня общая задолженность Минска перед Москвой составляет уже 1,7 миллиарда долларов. Как бы то ни было, по кредиту премьеры тоже не договорились.

Признание Южной Осетии и Абхазии

Беларусь до сих пор не признала независимость Южной Осетии и Абхазии, но Россия не скрывает, что ждет именно признания. И хотя незадолго до визита Путина в Минск некие *"осведомленные лица"* заявляли, что возможное предоставление Минску льготного кредита и переговоры по формуле цены на российский газ никак не увязаны с возможным признанием Беларусью Абхазии и Южной Осетии, сегодня кажется, что связка есть. По крайней мере, внешне это выглядит именно так: нет признания — нет кредита. Теперь придется ждать заседания Высшего госсовета. Посмотрим, смогут ли Медведев и Лукашенко договориться о том, о чем не смогли Путин, Лукашенко и Сидорский.

Виктор ДЕМИДОВ.
photo.bymedia.net

ДОСЛОВНО

КГБ поставлена задача... противостоять мировому финансовому кризису

Александр Лукашенко считает, что мировой финансовый кризис в определенной степени может затронуть интересы республики, призывая силовые структуры противостоять этому.

"Возможно, это (кризис. -- **Ред.**) затронет и нас, возможно, мы столкнемся с проблемами экспорта. Наша задача в очередной раз устоять, несмотря ни на что", -- заявил А.Лукашенко во вторник, посещая Комитет государственной безопасности.

Ссылаясь на оценки российских экспертов, он заметил: "Дна этого кризиса не видно".

Разговор с КГБ о финансовых проблемах не случаен. Согласно сообщению "Интерфакса", золотовалютные резервы Беларуси (исчисляемые по стандартам МВФ) только за сентябрь сократились на 459,7 миллиона долларов.

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ВЫБОРЫ

31-летний кардиохирург из Витебска стал сенатором

Ученик вице-премьера Александра Косинца, заведующий отделением сердечно-сосудистой хирургии Витебской областной клинической больницы, кандидат медицинских наук Александр Зеньков избран членом Совета Республики от Витебской области. Он стал самым молодым белорусским сенатором за всю историю существования верхней палаты Национального собрания.

В Витебске Александр Зеньков — фигура известная. Он первым в области выполнил операцию на открытом сердце, операцию по аортокоронарному шунтированию. В 28 лет Александр Зеньков стал заведующим отделением торакальной и сосудистой хирургии Витебской областной больницы, в 30 лет — возглавил отделение сердечно-сосудистой хирургии.

Несколько лет назад Александр Зеньков защитил кандидатскую диссертацию, его научным руководителем был тогдашний ректор Витебского медицинского университета, ныне вице-премьер Беларуси Александр Косинец. Работу в клинике кардиохирург Александр Зеньков совмещает с преподавательской деятельностью на кафедре хирургии факультета повышения квалификации и переподготовки кадров Витебского государственного медицинского университета.

Казалось бы, зачем талантливому доктору, чья карьера и так развивается достаточно успешно и стремительно, сенаторская должность?

— О том, что мою кандидатуру рассматривают на сенаторскую должность от Витебской области, я узнал, будучи на европейском конгрессе кардиохирургов в Ницце, — рассказал "Народной воле" Александр Зеньков. — Буквально через пару дней я уже выступал со своей программой на заседании перед депутатами местных советов Витебщины.

Колебаний не было. Новая должность не пугала, потому что мне давно уже приходится заниматься продвижением в нашей области новых технологий не только в лечении болезней сердца, но и в травматологию и ортопедию, нейрохирургию, в акушерство и гинекологию. Надеюсь, что новая должность будет мне только помогать.

— Оперировать меньше не будете?

— Прежде всего я доктор и никогда об этом не забываю. Но административные вопросы ведь тоже надо кому-то решать.

— Политикой вы интересуетесь? Знаете, какие функции у Совета Республики?

— Интересуюсь в меру. Надеюсь, что буду не случайным человеком в Совете Республики. Конечно, я не смогу заниматься вопросами промышленности и культуры, но что касается здравоохранения и социальной политики — то это, конечно, сфера моей деятельности.

— А знаете о том, что сенаторская зарплата, например, в разы больше врачебной?

— Пока о том, сколько я буду зарабатывать, речи не шло. Знаю только, что у меня будут помощники. Например, юрист. И знаю, что за мной стоит вся наша больница, область, так что непродуманных решений я просто не имею права принимать.



ПРЯМЫМ ТЕКСТОМ

Что предложил в своей предвыборной программе кардиохирург Александр Зеньков:

"Социальная защита и поддержка населения должны постоянно находиться в центре внимания нашего парламента.

Необходимо принятие закона "О материнском капитале" для увеличения дохода матери, направляемого на воспитание и становление ребенка в процессе формирования его личности. При этом расчет должен исходить не из прожиточного минимума, а из минимального потребительского бюджета.

Далее, к вопросу о питании детей. Необходимо на законодательном уровне усовершенствовать систему питания детей и привести в соответствие нормы детского питания и денежные вложения в него. Так, в настоящее время дети получают только до 50% от необходимой нормы питательных веществ. Отсюда, в том числе, высокий уровень общей детской заболеваемости — 1562,0 на 1000 детей.

Здоровье — понятие не медицинское, а социально-экономическое, это вопрос национальной безопасности государства. Сегодня ясно, что путь решения данного вопроса один — поэтапный переход к страховой медицине. Эту проблему необходимо решать на законодательном уровне — принять закон "Об обязательном медицинском страховании".

К СВЕДЕНИЮ

Какую зарплату получают сенаторы?

Вопрос оплаты труда высокопоставленных чиновников, как и народных избранников, в нашей стране является государственной тайной. Хотя, казалось бы, почему белорусский налогоплательщик не имеет права знать, сколько зарабатывают министры или депутаты? Например, в Великобритании такая информация в свободном доступе. Как пояснили нам в посольстве Великобритании в Минске, достаточно зайти на сайт правительства Соединенного Королевства, найти годовой отчет министерств, кликнуть строку "Зарплата" — и ваше любопытство будет удовлетворено.

Вопрос же "Народной воли" "Какую зарплату получают сенаторы?" поверг в легкое замешательство сотрудников бухгалтерии Совета Республики Национального собрания.

— Вы хотите, чтобы меня уволили с работы? — вопросом на вопрос ответили нам в бухгалтерии. — *Присылайте письменный запрос... А вообще, лучше сразу обращайтесь в Управление делами президента, потому что секретариат Совета Республики и Палаты представителей обслуживает Управделами президента, там депутатам и назначают зарплату.*

Бывший председатель Совета Республики Александр Войтович говорит, что зарплата белорусского сенатора такая же, как и у министров первой категории. При том, что деятельность в качестве сенаторов по сути является общественной нагрузкой к основной работе: в отличие от депутатов Палаты представителей члены Совета Республики остаются работать на прежних должностях.

Если учесть, что сегодня министры первой категории получают в среднем три с половиной миллиона рублей (о чем они сами заявляли на пресс-конференциях), значит, и зарплата сенаторов исчисляется в этих пределах.

Спикер верхней палаты Национального собрания 2-го созыва Александр Войтович вспоминает:

— Лично я получал зарплату в Академии наук. На момент моего председательствования в Совете Республики я являлся президентом Национальной академии наук Беларуси и по месту работы имел заработок выше. А вообще, схема выдачи зарплаты членам Совета Республики была такова: если по месту работы сенатор имел заработок выше, то ему ничего не доплачивали. Если ниже — то разницу выплачивали в Совете Республики. Конечно, большинство членов Совета Республики имели эти доплаты, особенно что касается учителей, врачей, представителей сельскохозяйственных, технических специальностей.

К слову, не надо забывать, что у бывших сенаторов, как и у депутатов, высокие пенсии. Согласно президентскому указу, пенсия бывшего сенатора составляет 65 процентов от зарплаты членов действующего состава Совета Республики.

ЛЮБОПЫТНО

А где знакомые нам лица?

В новый Совет Республики выдвинуто немало действующих депутатов верхней палаты Национального собрания. Обычно каждая область выдвигает в очередной созыв Совета Республики шесть новых кандидатов, а два места сохраняет за уже работающими сенаторами.

Особенностью этой кампании можно считать, например, отсутствие в списке будущих сенаторов от областей и города Минска нынешнего члена Совета Республики Александра Абрамовича — экс-председателя ЦИК, который в 1994 году объявил Александра Лукашенко президентом Беларуси. Судя по всему, на этот раз фортуна отвернулась и от политических долгожителей Николая Чергинца и Анатолия Малофеева, не выдвинуты на сенаторскую должность Николай Домашкевич, Владимир Дражин, Михаил Финберг... Из прежнего состава в Совет Республики вошли председатель "Беларусбанка" Надежда Ермакова, гендиректор обувной фабрики ООО "Марко" Николай Мартынов, глава Миноблисполкома Михаил Павлов, руководители Брестской, Гомельской и Гродненской областей — Константин Сумар, Александр Якобсон и Владимир Савченко. Компанию им составит и председатель Миноблисполкома Леонид Крупец, который впервые займет кресло сенатора.

Правда, пока еще рано говорить о полном составе Совета Республики четвертого созыва. Восьмерых членов должен избрать лично глава государства. И кто знает, не окажется ли в этом списке, например, Николай Чергинец, который именно по президентской квоте попал в прежний состав Совета Республики и который заседал в Совете Республики первого, второго и третьего созывов...

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

АДРАС

Па меншай меры на адным з участкаў парламентскія выбары не адбыліся

Сяржук Бахун быў на гэтых выбарах назіральнікам ад "Беларускага Хельсінкскага камітэта. *"Я назіраў за выбарамі на ўчастку №656 выбарчай акругі №110,* — расказвае Сяржук. — *Дзіўна, але факт: нават сыходзячы з лічбаў, якія былі ўпісаны ў афіцыйны выніковы пратакол, выбары на ўчастку не адбыліся. Мяркуйце самі: за гэтым участкам былі "замацаваны" 1673 выбаршчыкі. З іх прагаласавала толькі 819 чалавек. Гэта значыць, што на дадзены выбарчы ўчастак прыйшло менш за 50% ад агульнай колькасці выбаршчыкаў".*

Аднак, заўважыўшы, што яўка знаходзіцца пад пагрозай зрыву, сябры ўчастковай камісіі вырашылі "ратаваць" сітуацыю. *"Гэтае ратаванне ўсё роўна плёну не дало — выбары не адбыліся, аднак да мяне звярнуліся выбаршчыкі, якія паведамілі пра парушэнні,* — працягвае свой аповед Сяржук. — *Яны расказалі, што па раёне, дзе знаходзіцца ўчастак, ходзіць нейкая жанчына і прымушае ўсіх схадзіць на выбары. Здзівіла тое, што на руках у невядомай жанчыны быў спіс з прозвішчамі тых, хто адмовіўся ад удзелу ў галасаванні. Можна зрабіць выснову, што гэты спіс яна магла атрымаць толькі ва ўчастковай камісіі..."*

Сяржук Бахун тэрмінова накіраваўся да аднаго з дамоў, і якраз у гэты момант туды прыйшла "агітатарша". Пазней назіральнік склаў акт аб парушэнні Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь: *"Я засведчыў, што на участку №656 прыкладна пасля 17.00, калі была зафіксавана няяўка большасці выбаршчыкаў, па дамах №7 корпус 1 па вуліцы Андрэеўскай і №64 па вуліцы Захарава хадзілі людзі са спісамі непрагаласаваўшых і заклікалі людзей прыйсці прагаласаваць.*

Акрамя таго, жыхароў згаданага дома па вуліцы Андрэеўскай абтэлефаноўвалі невядомыя з аналагічнай просьбай".

Старшыня ўчастковай камісіі спадар Кушнір з актам быў азнаёмлены, але падпісваць яго адмовіўся... А вось выбаршчыкі, якіх прымушалі прагаласаваць, складзены Сержуком Бахуном акт падпісалі.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

НУ І НУ!

Удар па кампетэнцыі пракураў: пракурорам можна стаць, не маючы юрыдычнай адукацыі

Палата прадстаўнікоў унесла змены ў закон "Аб пракуратуры Рэспублікі Беларусь". Цяпер стаць супрацоўнікамі пракуратуры можна будзе без кваліфікацыйнага іспыту і не праходзячы стажыроўку.

Міністр юстыцыі **Віктар Галаванаў** патлумачыў, што *"пэўныя асобы, якія маюць пэўныя заслугі перад дзяржавай, могуць быць прызначаныя на больш высокія пасады ў сістэме пракуратуры без здачы кваліфікацыйнага іспыту".*

Міністр пацвердзіў, што змены ў законе не забараняюць стаць супрацоўнікамі пракуратуры асобам, якія не маюць юрыдычнай адукацыі.

Змены ў закон аб пракуратуры пракаментаваў Ігар Рынкевіч, былы адвакат Аляксандра Казуліна:

— Гэта вельмі сур'ёзны ўдар не толькі па кампетэнцыі будучых супрацоўнікаў пракуратуры. Гэта таксама закранае і іх маральныя якасці, паколькі чалавек, які сумняваецца ў сваіх ведах, будзе браць пад казырок і выконваць розныя загады. Адсюль будзе больш імкнення да абароны свайго мундзіра, а не закона.

Каму прадаюцца беларускія прадпрыемствы?

Беларуская валютна-фондавая біржа (БВФБ) зарэгістравала здзелкі па набыцці кампаніяй Harvest Invest Group акцый беларускіх прадпрыемстваў.

Набытыя 30,8% акцый ААТ "Брэсцкі завод бытавой хіміі" і 49,26% акцый ААТ "Брэсцкая трыкатажная фірма "Элма", сказана ў афіцыйным паведамленні БВФБ. Harvest Invest Group набыла 16.987 акцый Брэсцкага завода бытавой хіміі (30,8% статутнага фонду) за 1977,6 млн бел. руб. (акцыі прададзеныя па намінале — 116.240 бел. руб. за 1 акцыю).

Акцыі "Элмы" Harvest Invest Group набыла таксама па намінале — па 13.194 бел. руб. за 1 акцыю.

Завод бытавой хіміі з'яўляецца адным з найбуйнейшых вытворцаў парфумерыі і бытавой хіміі ў СНД. Прадпрыемства заснаванае ў 1970 годзе.

Трыкатажная фірма "Элма" створана ў 1940 годзе і зараз з'яўляецца адным з найбуйнейшых беларускіх прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці.

У той жа час у дэпартаменце па каштоўных паперах Мінфіна не змаглі даць звесткі аб кампаніі Harvest Invest Group і яе дзейнасці ў Беларусі.

У кіраўніцтве фірмы "Элма" таксама адмовіліся каментаваць здзелку па продажы акцый.

Ды каму ж прададзены вялікія пакеты акцый беларускіх прадпрыемстваў?

Паводле звестак Агенцтва фінансавых навін, Harvest Investment Group створана ў 2002 годзе і з'яўляецца амерыканскай інвестыцыйнай кампаніяй, якая спецыялізуецца на брокерскай і дылерскай дзейнасці і аперацыях з нерухомасцю са штаб-кватэрай у Атланце (ЗША). Паводле звестак рэсурсу progressivechurchatl.org, Harvest Investment Group з'яўляецца знешняй арганізацыяй Прагрэсіўнай царквы ў Атланце і ў асноўным складаецца з членаў гэтай рэлігійнай арганізацыі.

СКАНДАЛ

Студэнты-замежнікі пратэстуюць

Замежныя студэнты Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта ў панядзелак не выйшлі на заняткі.

Яны сабраліся ў актавай зале ВНУ і запатрабавалі правесці сустрэчу з работнікамі міліцыі з нагоды, як яны заявілі, пастаяннага іх уціску паводле расавых прыкмет.

Як паведамілі БелаПАН у Савецкім РАУС Гомеля, замежныя студэнты звярнулі ўвагу ўладаў, у прыватнасці, на напады на іх хуліганаў каля інтэрната, дзе жывуць грамадзяне Індыі. У маі адзін з іх атрымаў нажавыя раненні. Злачынцы затрыманы і цяпер знаходзяцца ў следчым ізалятары.

Праваахоўнікі паабяцалі студэнтам выставіць міліцэйскі патруль каля інтэрната.

У Гомельскім медуніверсітэце вучацца прыкладна 300 студэнтаў з Індыі, Непала, Нігерыі, Шры-Ланкі, іншых краін Азіі і Афрыкі.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

ЛЮСТЭРКА

Казус Абрамавай,

альбо Пусты гранатамёт Кучынскага

Калі Вольга Абрамава выйгравала парламенцкія выбары ў 2000-м і 2004 гадах, больш за ўсё мяне ўражвала (і, прызнаюся, раздражняла) яе нахабная (ці наіўная) упэўненасць у тым, што на выбарах яна перамагае дзякуючы выключна сваім палітычным здольнасцям і клапатлівай працы з насельніцтвам сваёй акругі. Выбары, якія толькі што прайшлі, даказалі відавочнае — Абрамаву, як і іншых дэпутатаў, "прызначалі". А цяпер не прызначылі.

Ведаеце, што больш за ўсё даказвае "намаляванасць" і аперэткавасць вынікаў гэтых выбараў? Не, не параза ў сваіх акругах яркіх апазіцыйных фігур. Аб'ектыўна кажучы, мы не ведаем, якая рэальная папулярнасць гэтых асоб сярод выбаршчыкаў — экзіт-полаў не было, сацыялагічных апытанняў таксама не праводзілася, у дэпутаты яны не абіраліся даўно, мы не ведаем, наколькі яны вядомыя людзям.

«Улады не палічылі патрэбным выставіць вядомага чалавека»

Больш за ўсё пра характар гэтых выбараў гаворыць неабранне Вольгі Абрамавай і Віктара Кучынскага. Віктар Кучынскі ў беларускі парламент (раней Вярхоўны Савет, цяпер Палата прадстаўнікоў) абіраецца нязменна з 1990 года, і ўвесь час па адной — Кобрынскай — акрузе. Вольга Абрамава першы раз перамагла ў сваёй акрузе на ўсходзе Мінска ў 1995 годзе, яшчэ на дэмакратычных выбарах.

28 верасня 2008 года Абрамава *"набрала"* 24 працэнты галасоў. Улады нават не палічылі патрэбным выставіць у яе акрузе нейкага вядомага чалавека (артыста, доктара) альбо мясцовага вертыкальшчыка, каб потым можна было казаць, што гэты чалавек настолькі важны і вядомы сярод выбаршчыкаў, што тыя прагаласавалі менавіта за яго. Улады выставілі раней не заўважанага ў палітычным жыцці і грамадскай актыўнасці 62-гадовага фізіка, галоўнага вучонага сакратара НАН Мікалая Казака.

Віктар Кучынскі, які калісьці сказаў легендарную фразу, што гатовы абараняць прэзідэнта нават з гранатамётам, у сваёй акрузе таксама заняў другое месца — яго "перамог" генеральны дырэктар ЗАТ "Аптымалсервіс" Аляксандр Зазуля.

«Нашы героі не трапілі ў «спісы»

Што здарылася? Чаму выбаршчыкі раптам адвярнуліся ад сваіх дэпутатаў, якія больш як дзесяць гадоў працуюць у акрузе, вырашаючы іхнія канкрэтныя праблемы — Абрамава і Кучынскі, нарэшце, адны з нямногіх, хто выступаў супраць адмены льгот?

Можа, Аляксандр Лукашэнка недзе публічна выступіў супраць гэтых кандыдатаў? Альбо мясцовыя ўлады разгарнулі шалёную прапагандысцкую кампанію супраць Абрамавай і Кучынскага, закляйміўшы іх як ворагаў стабільнасці ці прэзідэнта? Не, нічога такога не было. Проста нашы героі не трапілі ў "спісы".

Калі Вольга Абрамава выйгравала выбары ў 2000-м і 2004 гадах, больш за ўсё мяне ўражвала (і, прызнаюся, раздражняла) яе нахабная (ці наіўная) упэўненасць, што на выбарах яна перамагае дзякуючы выключна сваім палітычным здольнасцям і клапатлівай працы з насельніцтвам сваёй акругі. "Вось апазіцыя не ўмее працаваць з выбаршчыкамі, — гаварыла Абрамава, — яна са сваёй мовай і дэмакратыяй не разумее іхніх патрэб, а я са сваім змаганнем за камунальныя паслугі ведаю, што трэба людзям".

Чытаючы гэта, мне хацелася задаць пытанне: *"Вольга Міхайлаўна, няўжо вы не разумееце, што перамагаеце толькі таму, што ўлада вам гэта дазваляе?" І другое: "Як вы думаеце, калі ўлада вырашыць не пусціць вас у парламент, вы выйграеце гэтыя выбары?"*

Калі б Вольга Міхайлаўна шчыра казала: "Так, мяне прызначылі, але я стараюся выкарыстаць гэта дзеля дэмакратыі і маіх выбаршчыкаў", — я б зразумеў, гэта было б сумленна.

Зрэшты, адказу на мае пытаньні не давялося доўга чакаць. З пэўных прычын на гэтых, вераснёўскіх, выбарах Абрамава, Кучынскі, Гайдукевіч, Красуцкі, Касцян ды іншыя найбольш прыкметныя дэпутаты Палаты не трапілі ў зацверджаныя спісы "прызначаных" дэпутатаў. Гайдукевіч адчуў адразу, што шанцаў няма, і не вылучаўся, рознымі супярэчлівымі заявамі спрабуючы захаваць твар, Касцян, Красуцкі ды іншыя зняліся ўжо пасля рэгістрацыі кандыдатамі (ці дачакаліся прапаноў наконт нейкіх пасад, ці ім проста даходліва "растлумачылі"). І толькі Абрамава і Кучынскі пайшлі на выбары, спадзеючыся на сваю папулярнасць сярод жыхароў акругі. Ці гэта наіўнасць, ці крок адчаю — не мне меркаваць.

«Не выбаршчыкі тут вырашаюць, і не варта прыкідвацца незалежнай»

Большасці дэпутатаў Палаты ўсё выключна зразумела — ім *"аказваюць давер"*, іх прызначаюць, яны ў адказ служаць. Вольга Абрамава як інтэлігентны чалавек ніяк не хацела змірыцца з такой фармулёўкай — празаічнай і непрывабнай для яе, такой яркай і здольнай палітычнай фігуры. Але цяпер рэальнасць зазірнула ў вочы прадстаўніцы **"канструктыўнай апазіцыі"** — *палітычная вага, самастойнасць і клопат пра выбаршчыкаў не маюць ніякага значэння, больш за тое, гэта падазроныя якасці.* Абрамаву, як і ўсіх іншых дэпутатаў, "прызначалі" і ў 2000-м, і ў 2004-м. А цяпер не **"прызначылі"**.

Можа, Абрамава рэальна набрала 28 верасня і 80 працэнтаў — я цалкам такое дапускаю, але не выбаршчыкі тут вырашаюць, і не варта прыкідвацца незалежнай.

Тут такая вядомая псіхалагічная аберацыя. Калі мы недзе перамагаем, нам здаецца, што гэта выключна дзякуючы нашым здольнасцям, талентам і намаганням. Калі прайграем, то — вінаватыя надвор'е, абставіны, варожыя падкопы і гэтак далей. Так і Абрамава, напэўна, *прымушала сябе верыць*, што яна перамагала дзякуючы сваёй клапатлівай працы па "вяртанні пенсіянерам ільготнага праезду ў дачны перыяд". Не, Вольга Міхайлаўна, вас *прызначалі*, а вы за гэта павінны былі казаць *"дзякуй"*. А вы, няўдзячная, галасавалі супраць адмены льгот. Зрэшты, калі я бачу, як асцярожна вы даяце інтэрв'ю пасля выбараў, калі я чытаю, як вы заклікаеце вашых выбаршчыкаў не аспрэчваць вынікаў галасавання па вашай акрузе, заклікаеце іх спыніць іхні "стыхійны бунт" — я разумею, што для вас не ўсё страчана. Магчыма, улада яшчэ ацэніць вашу *"стрыманасць"*.

Віталь ЦЫГАНКОЎ.
("Свабода")

Беларусь чакае "бульбянога рэкорду"

У Беларусі валавы збор бульбы з улікам уборкі ў асабістых падворках у бягучым годзе дасягне 9 мільёнаў тон, паведаміў на брыфінгу ў Мінску першы намеснік па навуковай рабоце генеральнага дырэктара НПЦ НАН Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве Мар'ян Рубель.

Паводле яго слоў, атрыманню багатага ўраджаю "другога хлеба" садзейнічалі не толькі спрыяльныя ўмовы надвор'я, але і інавацыі беларускіх вучоных. З 76 сартоў, раянаваных у Беларусі, 38 атрыманы айчыннымі вучонымі. *"Па смакавых уласцівасцях беларуская бульба значна пераўзыходзіць замежную прадукцыю,* — сказаў Мар'ян Рубель. — *Пры гэтым сярэдняя крухмалістасць беларускай бульбы складае 15 працэнтаў і больш, у той час як імпартнай — 9—12 працэнтаў".*

У цэлым, паводле даных Мінсельгасхарча, у сельгасарганізацыях Беларусі бульба ўбрана з паловы засеяных плошчаў. Сярэдняя ўраджайнасць сёлета складае 208 ц/га, што на 18 цэнтнераў больш, чым у мінулым годзе. Самая высокая ўраджайнасць у бягучым годзе ў гаспадарках Гродзенскай і Магілёўскай абласцей — адпаведна 238 і 227 ц/га.

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

«АТОМНЫЙ» ПРОЕКТ

Франция «умывает руки»

Чрезвычайный и Полномочный посол Франции в Беларуси Мирей Мюссо в интервью информационному агентству "Интерфакс-Запад" призналась, что *"тендерные требования белорусской стороны по строительству АЭС не соответствуют возможностям французской стороны"*. Отвечая на вопрос, готова ли Франция принимать участие в тендере на строительство АЭС в Беларуси, посол заявила следующее: *"Насколько я знаю, тот тип реактора, который хотят строить в Беларуси, не совсем похож на те АЭС, что строит компания Areva... Можно участвовать в тендере в том случае, если условия тендера соответствуют твоим возможностям. Если АЭС, которые строит Areva, не соответствуют планам белорусских властей, какой смысл участвовать в тендере?"* При этом, однако, Мирей Мюссо особо подчеркнула, что *"посольство не вмешивается в данный вопрос, это коммерческие переговоры"*.

Все это, конечно, выглядит очень странным. Во-первых, франко-германская компания Areva одной из первых откликнулась на белорусское приглашение участвовать в реализации проекта по строительству АЭС. Также Areva предоставила белорусской стороне очень подробную техническую документацию, касающуюся строительства станции. И до сих пор принципиально важных спорных вопросов не возникало.

Во-вторых, совершенно непонятны высказывания посла по поводу "непохожего типа реактора". Сейчас во всем мире строят гражданские реакторы одного типа — водно-водяные. Они отличаются относительной простотой и дешевизной в эксплуатации вкупе с достаточно высоким уровнем безопасности. И, опять же, до сих пор белорусские чиновники называли компанию Areva одним из вероятных претендентов на строительство АЭС в нашей стране, не делая каких-либо оговорок относительно типа реактора.

Наша справка

AREVA NP — франко-германская компания, дочернее предприятие компаний AREVA и Siemens AG, занимающееся разработкой и производством оборудования для атомных электростанций. Компания создана в 2001 году под именем Framatome ANP путем слияния активов в области атомной энергетики компаний Framatome (66% акций) и подразделения KWU Nuclear Division концерна Siemens AG (34% акций). Компания занимается разработкой и производством промышленных и исследовательских реакторов, производством топлива, систем управления и контроля, проектированием АЭС "под ключ" и их модернизацией.

Вполне вероятно, что нынешние высказывания французского посла — результат политических игр, весьма далеких от Беларуси. Попросту говоря, западноевропейская Areva и российский "Росатом" при поддержке правительств своих стран делят "сферы влияния" в Европе и на постсоветском пространстве.

Видимо, не случайно практически одновременно с высказываниями Мирей Мюссо об отказе "Аревы" от строительства АЭС в Беларуси прозвучало заявление российских атомщиков. Как сказал журналистам некий источник в "Росатоме", эта госкорпорация *"ждет конкретных предложений от Беларуси по сооружению АЭС"*. При этом неназванный источник отметил, что "пока конкретики в этом вопросе нет, кроме заявленного желания руководства Беларуси построить новую АЭС на одной из трех рассматриваемых для этой цели площадок".

Как передает ИТАР-ТАСС, по словам того же источника, *"если коллеги из Беларуси обратятся с конкретным предложением, то мы сможем построить там современную АЭС... Россия даже может выделить на это строительство кредит. В бюджете средства на кредитование сооружения АЭС в других странах предусмотрены"*. Как видим, какой-либо тендер даже не упоминается. Речь идет о прямом обращении белорусского правительства в "Росатом". Нет и какого-либо упоминания о конкурентах — той же Areva, например.

Но большинству присутствовавших представителей "старой Европы" выступление немецкого коллеги понравилось, а один профессор из Кембриджского университета и вовсе в восторге провозгласил его "прорывом в области политической мысли".

Итак, неужели и на самом деле прорыв — "назад в будущее" или, точнее, "вперед в прошлое"?

Вторая половина XIX века действительно была относительно мирным периодом, по крайней мере, для Европы. Но, во-первых, история никогда полностью не повторяется. Или повторяется как фарс (или трагифарс), как пародия на саму себя. И, во-вторых, тот самый "мирный период" не случайно, наверно, закончился "сараевским эпизодом" и беспрецедентной всемирной бойней. Так что вряд ли есть смысл слепо копировать не оправдавшие себя образцы.

Но что же в таком случае делать, как отремонтировать или чем заменить сломавшуюся систему?

Выступая недавно в Манчестере, министр иностранных дел Великобритании Дэвид Милибэнд говорил о необходимости установления нового мирового порядка, в который вошли бы и страны Европы, включая Россию, которая, по словам министра, должна стать полноправным членом сообщества, "построенного на соблюдении правил".

Один из участников манчестерских дебатов, организованных Всемирной службой Би-Би-Си и Британским Советом, выражал Милибэнду: дескать, бесполезно навязывать России наши ценности, она их не принимает! Они, русские, мыслят в терминах геополитики, а не всеобщей взаимозависимости, как это пытаемся делать мы. Ну и давайте оставим их в покое, пусть их, давайте снова научимся сосуществовать, говорил он.

Заметьте — не искать общий язык, как это было еще недавно, а опять всего лишь сосуществовать — как бы в разных, взаимоисключающих ценностных системах.

Похоже, что такой "прорыв" случился сразу во многих политологических головах в разных странах Европы, а вовсе не только в Германии. Внутри Европейского Союза наметился серьезный раскол, причем речь не только об отношении к России, Грузии или Украине. Европейцы по-разному представляют себе и развитие ситуации в Ираке и Афганистане, Иране и на Ближнем Востоке.

Велики отличия и во взгляде на кризис международного права — одно только неразрешимое противоречие между территориальной целостностью государств и правом наций на самоопределение чего стоит... Но поражает более всего именно столь быстрое возвращение многих умов к идеям прошлого и даже позапрошлого столетия.

Можно спорить до бесконечности о верности или неверности такого подхода. Возможно, миру на самом деле ничего другого не остается, как только начать вырабатывать снова правила сосуществования. Общего выживания. Пусть без любви, но зато и без войны или слишком крупных неприятностей.

Каких неприятностей? А таких, например: Россия обидится на Запад, тот обидится в ответ на Россию, а та за это подружится с Ираном, прямо или косвенно поможет ему с его ядерной программой, а в результате на Ближнем Востоке случится большая война. Которая, если и не перекинется на весь мир, то, по крайней мере, взорвет и без того хрупкую мировую капиталистическую экономику. Нет, только не это!

Логично? Может быть. Но, согласитесь, после всех надежд 1990-х как-то грустно. Не конец истории, не открытые навстречу друг другу общества, не триумфальное шествие свободы и общих ценностей, а снова — двери на запоре от непонятных, неприятных и, наверное, опасных соседей по коммунальной квартире Земля. И пусть они себе делают что хотят со своими младшими — мы в их семейные дела не лезем, а они в наши — тоже.

Андрей ОСТАЛЬСКИЙ.
Русская служба Би-Би-Си.

ФОТОВЗГЛЯД

Канцлер Германии Ангела Меркель и российский президент Дмитрий Медведев встретились в Петербурге.

Международная ярмарка современного искусства в Кельне (на фото — "Шпагат" Лилли Хилл).

А в индийском городе Амритсар отметили очередную годовщину со дня рождения Махатмы Ганди. Дети изображали своего кумира.

КАЛЕЙДОСКОП

Чайная услуга

Каждого прибывающего в Великобританию иностранца отныне будут угощать чашкой настоящего английского чая с традиционным печеньем.

Тем самым власти пытаются улучшить первое впечатление о стране, известной своей изменчивой погодой, а также перебоями, с которыми работают крупнейшие британские аэропорты.

Как сообщается, новая "чайная услуга" вводится в крупнейших аэропортах Соединенного Королевства с ноября текущего года.

Среди существующих на Британских островах сортов печенья выбор сделан в пользу знаменитого сорта с малиновой начинкой, сообщает ИТАР-ТАСС.

Изображение женского силуэта

В Швеции скоро появится еще один знак пешеходного перехода с изображением женского силуэта. Его будут устанавливать рядом с привычным, на котором изображена мужская фигура, шагающая по "зебре". Дизайн нового дорожного указателя утвердило шведское правительство, передает НТВ. Это сделано не для того, чтобы покончить с дискриминацией по половому признаку.

Власти удовлетворили просьбу жителей городка Маришталь, где родился художник, который в 1955 году придумал всем известный "мужской" пешеходный знак. Шведские водители называют его "господин Гарман", и земляки художника решили, что господину, должно быть, скучно стоять на перекрестках в одиночестве.

Поймал пулю зубами

Жителю столицы Хорватии Загреба удалось остаться в живых после выстрела в упор, поймав пулю своим зубным протезом, сообщает Ananova.

Инцидент произошел в ходе ссоры из-за просроченного долга. Оппонент 37-летнего Стипе Цавловича внезапно вытащил пистолет и выстрелил в него и его жену Мирну с очень близкого расстояния. Пуля оцарапала щеку женщины и, отрикошетив от скулы, полетела прямо в рот ее мужа. Однако затем, к удивлению окружающих, пуля просто упала на землю, не причинив Стипе практически никакого вреда. По его словам, он только почувствовал, как что-то ударило в его вставные зубы, после чего выплюнул горячий металл.

Полицейские эксперты полагают -- Стипе остался жив потому, что пуля растеряла большую часть своей энергии во время рикошета.

Несостоявшийся убийца задержан, ему предъявлены обвинения в применении огнестрельного оружия.

Танцы для собак

Японцы учатся вальсировать, отплясывать польку, танцевать зажигательную румбу...с собаками. В Токио открылась школа танцев для собак и их хозяев.

Отбил у акулы

Житель американского штата Флорида Грег Ленуар буквально вытащил из пасти акулы своего домашнего питомца -- рэт-терьера по кличке Джейк.

Нападение полутораметровой акулы произошло в гавани Флорида-Киз, куда 53-летний Ленуар приходит плавать со своей собакой каждый день. "Она появилась прямо из-под Джейка. Джейк завизжал жутким визгом, и она утащила его под воду. Я тут же нырнул за ним и со всей силы ударил акулу кулаком. И она отпустила его", -- рассказал Ленуар.

Он объяснил, что бросился на помощь Джейку, совершенно не заботясь о собственной безопасности, потому что эта собака стала настоящим членом его семьи, заменившим ему и его супруге детей, которых у них нет.

ДАТЫ

Если бы поляки в свое время не сломали зубы...

На днях бывший президент Польши, лауреат Нобелевской премии мира Лех Валенса отметил 65-летие со дня рождения и 25-летие со дня получения Нобелевской премии.

Валенса родился 29 сентября 1943 года в местечке Попово в крестьянской семье с аристократическими корнями. Воспитывался без отца в многодетной семье. Окончив школу механизации сельского хозяйства, служил в армии и работал автомобильным электромехаником. В 1967 году Валенса устроился электриком на Гданьскую судоверфь. Активно участвовал в деятельности нелегальных профсоюзов.

В 1970 году — член забастовочного комитета. После окончания забастовки арестован и осужден на год тюремного заключения. В 1976-м уволен с "волчьим билетом". В 1979-м стал соорганизатором свободных профсоюзов. Вернулся на работу и в августе 1980 года возглавил забастовку на Гданьской судоверфи. В апреле 1981-го на съезде делегатов независимого профсоюза "Солидарность" был избран его председателем.

Во время военного положения был интернирован. В 1988-м был одним из организаторов забастовки, которая закончилась соглашением с правительством и организацией "круглого стола" — переговоров властей с оппозицией. В августе 1989 года инициировал создание в сейме коалиции, которая стала основой первого послевоенного некоммунистического правительства во главе с Тадеушем Мазовецким. В 1990—1995 годах — президент Республики Польша и верховный главнокомандующий Вооруженных сил. Лауреат Нобелевской премии мира (1983). Проживает в Гданьске. С женой Данутой имеют восьмерых детей: четыре сына и четыре дочери.

Лех Валенса написал много книг и дал много интервью, в которых высказал немало интересных и важных суждений. Так, отвечая на вопрос одного российского журналиста о взаимоотношениях России и Европы, он отметил:

— Мы нужны друг другу навсегда. Если бы я был президентом Польши, то добивался бы нового "плана Маршалла" не только для своей страны, но и для России. Крах коммунизма был для Запада неожиданностью, тогдашние западные политики провалили экзамен, у них не было плана, как действовать. И такого плана у них нет до сих пор. Не понимают, что помогать сейчас России, всем нам — в их же завтрашних интересах. При этом Запад сегодня сам нуждается в реформировании — я сейчас много езжу по миру и всюду это доказываю. Он должен реформироваться, иначе проиграет, как проиграл коммунизм. США — безусловный лидер в военном и экономическом отношении, но командовать миром у них не очень получается.

Касаясь роли легендарного профсоюза "Солидарность" и его методов борьбы с диктатурой, сказал:

— В Польше постоянно находилось 200 тысяч советских военных. Миллионная армия стояла рядом с нашими границами. И у них было оружие массового поражения. Мы это знали. Но мы были полны решимости не возвращаться на работу. Они могли нас убить, но победить нас они не могли. Они могли нас разогнать, но не могли заставить работать. Так что у коммунистов не было против нас эффективного оружия...

То выступление повлияло больше, чем какое-либо другое событие в мире. Чем дальше движется история, тем очевиднее становится вся важность этих событий.

Без его Европейский Союз не смог бы расшириться. Германия не смогла бы объединиться. И другие страны не смогли бы стать свободными, если бы поляки в свое время не сломали зубы советскому медведю. Когда другие страны освобождались от его объятий, он уже не мог кусаться.

Сергей ИВАНОВ.

Вопрос признания Южной Осетии и Абхазии сложен

Такое мнение высказал глава МИД Казахстана Марат Тажин, выступая в вашингтонском Фонде Карнеги для содействия всеобщему миру, передает ИТАР-ТАСС.

По его словам, позиция Казахстана заключается в том, что "принцип территориальной целостности является ключевым в международном праве". "В то же время не должны применять двойные стандарты, — отметил министр. — Мы не признали Косово, и мы не признали Абхазию и Южную Осетию".

Если поезд опаздывает

Немецкое правительство одобрило законопроект министерства юстиции, который предусматривает выплату денежной компенсации пассажирам, если их поезд опаздывает.

Согласно одобренному немецким правительством законопроекту, пассажир опоздавшего на час поезда будет иметь право получить четверть стоимости билета обратно. Если поезд опоздал более чем на два часа — половину.

Новые финансовые правила

В ответ на разрастающийся финансовый кризис Еврокомиссия представила пакет мер по усилению регулирования банковской системы. Брюссель предлагает увеличить резервы банков для покрытия рисков, ужесточить условия выдачи кредитов заемщикам, дать возможность национальным правительствам наблюдать за зарубежными операциями финансовых институтов.

При этом фактически Еврокомиссия дала зеленый свет национализации банков правительствами европейских стран.

Эти предложения Еврокомиссии еще должны утвердить страны — члены ЕС и Европарламент.

Рэп про ООН

Генеральный секретарь Организации Объединенных наций Пан Ги Мун прочитал рэп на церемонии празднования пятидесятилетия Ассоциации Объединенных наций США (UNA-USA).

Желание приобщиться к хип-хопу Пан Ги Мун объяснил тем, что в зале присутствовал рэпер Jay-Z, который получил гуманитарную награду ООН.

"Нас легко найдешь в Гугле/Очень мы глобальные/У ООН дела ништяк/Спасибо Теду Тернеру, что все вот так", -- декламировал со сцены Пан Ги Мун. Уточняется, что генсек ООН своим творчеством изрядно насмешил находившегося в зале Jay-Z, а также других известных гостей церемонии.

Где живет Дмитрий Медведев?

Тем, что у "гаранта Конституции" в собственности несколько квартир в Москве и Санкт-Петербурге, никого не удивишь. Даже чиновники рангом пониже имеют в наше время по несколько квартир. Но недвижимость — это одно дело, а совсем другое — дом, где ты с семьей проводишь большую часть времени, рассуждает сайт VseDoma.ru.

Нынешний президент Дмитрий Медведев, как и Владимир Путин, родом из Санкт-Петербурга. На заре свой карьеры Медведев с женой жили в скромной двухкомнатной квартире на окраине Питера, в микрорайоне "Купчино". Затем перебрались поближе к центру — в Московский район — в четырехкомнатную квартиру на улицу Фрунзе. Эту квартиру в семиэтажном сталинском доме Медведев оставил за собой и после переезда в Москву.

Здесь же в Москве, согласно данным Единого реестра собственников жилья, за четой Медведевых числятся две квартиры: одна в элитном жилом комплексе "Золотые ключи-1" на Минской улице, а вторая на улице Тихвинской.

Первую квартиру президента с полным правом можно назвать элитной. Общая ее площадь — 364,5 кв. метра. В квартире четыре спальни, три туалета, кабинет, столовая и просторная гостиная с литыми колоннами из горного хрусталя и мраморными полами. Комплекс, в котором находится квартира президента, располагает всей необходимой для жизни и досуга инфраструктурой: сауна, фитнес-клуб, тренажерный зал, салон красоты, под стеклянной крышей — зимний сад, а во дворе футбольная площадка. Ежемесячные расходы на коммунальные платежи в этом доме доходят до 5 тысяч долларов. Соседи президента — банкиры, представители крупного бизнеса и сам патриарх Алексий II.

Вторая квартира Медведева расположена в "министерском" доме по улице Тихвинской, 4. Квартирами здесь владеют многие члены правительства, как настоящие, так и бывшие: Рашид Нургалиев, Леонид Рейман, Валерий Зорькин. Общая площадь второй президентской квартиры гораздо скромнее — всего 174 кв. метра. Про обстановку и внутреннею отделку этой квартиры ничего не известно.

Однако ни в одной из московских квартир семья Медведевых не живет. Ведь даже самая просторная квартира с индивидуальной планировкой в многоэтажном, пусть даже элитном, доме не сравнится с собственным домом на природе. Поэтому живут они на даче. Домом Медведевых стала президентская резиденция Горки-9, в которой раньше жил Борис Ельцин с семьей. Это самая большая президентская резиденция: среди соснового леса здесь размещаются жилая зона с домом и рабочая — для проведения встреч и переговоров, теннисный корт, вертолетная площадка.

Никакого указателя на 18-м километре Рублево-Успенского шоссе на повороте в Горки-9, конечно же, нет — только спецбудка ГАИ. Отсюда рукой подать до резиденции Владимира Путина в Ново-Огарево: дорога от дома президента к дому премьера занимает не больше 10 минут.

Еще одна президентская резиденция в Подмосковье — замок Майендорф. Несмотря на свой официальный статус правительственной резиденции, замок Майендорф не является территорией, закрытой для посетителей, — там регулярно проводятся частные корпоративные и праздничные мероприятия.

Также в распоряжении Дмитрия Медведева, пока он находится в должности президента, будут и другие резиденции — сочинский "Бочаров Ручей", "Волжский Утес" в Самарской области, екатеринбургская резиденция, карельская "Шуйская Чупа", валдайские "Долгие Бороды", тверское "Завидово", Константиновский дворец в Стрельне под Санкт-Петербургом.

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ЗНАЁМЫЯ ІМЁНЫ

Былі ж часы!

Андрэй Рамашэўскі ўзгадвае пра самую піўную партыю Беларусі і маладзёжную тусоўку 1990-х.

Пакаленне, актыўная маладосць якога прайшла на гучных мітынгах пачатку 1990-х, даўно ўжо жыве іншым жыццём. Месца піўных тусовак і дзёрзкіх акцый у цэнтры Мінска занялі сям'я і праца. Адзінкі захоўваюць правакацыйны стыль у знешнасці, гэтак жа адарвана, як і 15 гадоў таму, апранаюцца, адмаўляюцца стрыгчы доўгія, але рэдкія ўжо валасы альбо наадварот гадуюць бараду. Большасць 30—40-гадовых бачаць толькі офіс ды сям'ю, а пра гарачыя студэнцкія гады з мітынгамі на плошчы Незалежнасці ўзгадваюць з замілаваннем падчас рэдкіх пасядзелак у дарагіх барах у Беларусі ці ўжо за мяжой.

Андрэя Рамашэўскага можна назваць адным з тых, пра каго легенды ходзяць яшчэ дагэтуль, хоць ён ужо даўно жыве з сям'ёй у чэшскай вёсачцы і працуе праграмістам. Яшчэ 15 год таму яго ведала ці не ўся нефармальная мінская тусоўка і палова міліцыі.

Рамашэўскі, вядомы таксама як Борман, быў не толькі ўдзельнікам шматлікіх палітычных перформансаў пачатку 90-х, за што неаднаразова быў затрыманы, але і адным з заснавальнікаў і старшынёй легендарнай Партыі аматараў піва, у якую ўваходзілі дзеячы мастацтва Лявон Вольскі, Міхал Анемпадыстаў, Сяргей Скрыпнічэнка і іншыя. Сёння, нягледзячы на час і адлегласці, Борман кантакт з Беларуссю не губляе: кожны год ён прыязджае на фестываль "Басовішча", сустракаецца з "партыйцамі" і проста сябрамі. Ну і гэтак жа п'е піва, праўда, зараз выключна чэшскае.



Пра самую піўную партыю Беларусі

Партыя аматараў піва — была бадай самай незвычайнай партыяй у Беларусі і, што цікава, не такой ужо і малакольканай. А сярод сяброў партыі можна сустрэць і такіх вядомых людзей, як Лявон Вольскі, Міхал Анемпадыстаў (аўтар партыйнай эмблемы), Севярын Кваткоўскі... У чым была прычына такой прыцягальнасці? У назве, праграме, статуце?

— Думаю, што ў першую чаргу справа была ў назве. Не так цяжка назбіраць некалькі соцень чалавек у партыю, якая мае адкрыта папулісцкую назву. Статут партыі колькасць сяброў хутчэй абмяжоўваў, бо прыём новых сяброў — ёсць бюракратычны працэс. Ну а праграму партыі бачыў толькі партактыў — не тое каб мы яе ад кагосьці хавалі, але не кожнага яна цікавіла. Таксама важную ролю на пачатку стварэння партыі адыгралі і асабістыя кантакты.

— А як увогуле ўзнікла партыя, і якая роля табе належала на самых пачатках?

— Гэта было ў 1993 годзе. Я тады вучыўся на хімфаку, на якім так і не давучыўся, бо якраз тады атрымаў загад ствараць партыю. Да мяне прыйшлі мае старыя знаёмыя Вадзім з Юрам і кажуць: маўляў, у нас у наступным годзе будуць парламенцкія выбары і не было б нічога дрэннага, калі б мы атрымалі ў парламенце нейкія пару месцаў — гэта, зразумела, дапамагло б неяк нашаму бізнесу, і ты таксама не павінен быў бы займацца студэнцтвам розным.

Чаму не? Знаёмыя мы з імі былі ўжо даўно, бачыліся яшчэ ў клубе Льва Крывіцкага "Современник", потым проста на нейкіх акцыях Крывіцкага, пэўны час працавалі разам у самвыдаце. На пачатку 90-х мы неяк разышліся (я пайшоў вучыцца, яны рабіць бізнес), а потым вось зноў сышліся.

Што тычыцца стварэння партыі, то практыку ў такіх бюракратычных справах я ўжо меў — супрацоўнічаў і з Сацыял-дэмакратычным саюзам Крывіцкага, быў на ўстаноўчым сходзе БНФ у Вільні, на ўстаноўчых сходах іншых арганізацый. Нават на ўстаноўчы з'езд ЛДП Жырыноўскага пралез. Пачытаў я законы аб партыях, якія тады існавалі, колькі чалавек патрэбна на ўстаноўчы сход, потым падрыхтаваў паперы на рэгістрацыю і арганізаваў з'езд. Тады для заснавання партыі патрэбна было ўсяго сто ўдзельнікаў.

Першы з'езд адбыўся ў 1993 годзе ў Доме літаратараў. Але самым масавым быў другі з'езд, у 1994-м, калі прымалася перадвыбарная праграма партыі. Ён праходзіў два дні, і для гэтых мэт нават быў арандаваны Палац чыгуначнікаў. З ягонага ганку ўдзельнікам з'езда і звычайным мінакам іграли гурты Zyhimont Vaza, "Крама" і іншыя.

"На з'езд быў запрошаны кожны сябра партыі. З'езд праходзіў у вялікай зале, а ўнізе ў фае піва раздавалася ўсім сябрам партыі па мандату. Бясплатна! Былі кампосцеры. Атрымаў бутэльку — зрабілі дзірку, атрымаў другую бутэльку — другую дзірку, атрымаў трэцюю бутэльку — трэцюю дзірку, атрымаў чацвёртую бутэльку — зрабілі чацвёртую дзірку. Той, хто артымаў чатыры дзіркі — не меў права галасаваць, бо нам трэба было правесці свой спіс кандыдатаў: той, хто напіўся, — не галасаваў. Такім чынам, мы абмежавалі вышэйшы орган людзьмі, якія нармальна працуюць галавой. А той, хто за гэты час паспеў выпіць чатыры бутэлькі піва, не быў цікавы для нас як чалавек, які будзе вырашаць палітыку партыі.

— Такім чынам, нягледзячы на назву, у партыі цанілася цвярозая галава. А як вы прыйшлі да такой незвычайнай назвы?

— Зразумела, што пасля рашэння стварыць партыю прыйшло і рашэнне, што трэба яе неяк назваць. Ёсць розныя спосабы: традыцыйныя, паводле ідэалогіі, але бываюць выпадкі правакацыйнай назвы. Мы выкарысталі маркетынгавы спосаб. Ну і, канешне, улічвалі польскі прэцэдэнт, там таксама існавала Партыя аматараў піва. Польская партыя была нашай выбранай мадэллю.

Дарэчы, польская Партыя аматараў піва на сваіх першых выбарах атрымала 10% ці 15%. Гэта было неверагодна шмат, гэта была трэцяя па колькасці фракцыя. Так што нічога новага мы не прыдумалі. З нас смяяліся, казалі: "Вы што, ідыёты?" Але мы вырашылі, хай нас лепш будуць прымаць за ідыётаў, але мы атрымаем свае месцы ў парламенце. Але ўсё ж мы прайгралі. Па той прычыне, што ў нас з Польшчай крыху розныя выбарчыя сістэмы: яны маюць прапарцыянальную сістэму са спісаў партый, а ў нас — мажарытарная сістэма.

«Паслужны спіс» Бормана

Цяжка нават пералічыць, у якіх толькі акцыях і арганізацыях ён не ўдзельнічаў і ў якія гісторыі не трапляў. Ён быў сябрам Дэмакратычнага саюза Навадворскай — адной з самых вядомых антысавецкіх арганізацый, супрацоўнічаў з беларускімі сацыялдэмакратамі Льва Крывіцкага, прымаў удзел як зарэгістраваны госць ва ўстаноўчым з'ездзе БНФ у Вільні. На пачатку 90-х нават паспеў пасядзець у намётах на Плошчы незалежнасці.

Было нават сяброўства з транснацыянальнай (насамрэч італьянскай) радыкальнай партыяй Partito radicale. Дарэчы, з ініцыятывы гэтай няўрадавай арганізацыі быў утвораны суд у Гаазе. Да біяграфіі можна яшчэ дадаць і каардынацыю антыпрагібіцыянізму на Беларусі — руху за адмову ўсіх забарон (у тым ліку, дарэчы, і адмову забароны на ўжыванне ўсіх відаў наркотыкаў).

У канцы 80-х — пачатку 90-х свет незваротна змяняўся. І, напэўна, тады было проста немагчыма застацца па-за працэсамі, што адбываліся ў грамадстве. Асабліва калі ты малады, цікаўны і адкрыты да ўсяго новага і невядомага. Савецкі Саюз знікаў на вачах, а ў краінах зараджаліся нацыянальныя рухі, што прагнулі незалежнасці для сваіх народаў. Не абышлі гэтыя працэсы і Беларусь... Кажуць, што для беларусаў пераломным момантам былі Курапаты. Андрэў трапіў на першыя Курапаты ў 1988 годзе, будучы яшчэ школьнікам.

— Курапаты 1988-га былі дастаткова цікавымі. Прыйшоў я туды па аб'яве... Спачатку паслухалі Пазьняка каля могілак, пасля пайшлі ў поле, там, дзе сёння відаць нейкае Уручча. Больш за ўсё памятаю надвор'е — было страшэнна халодна і падаў мокры снег. Ну а пасля, калі мы вярталіся да Мінска, нас ужо чакалі міліцыянты с дубінкамі. У першы раз пабачыў! Ані дубінкай, ані газам я не атрымаў — быў дастаткова малады і хуткі. Ну, а на Курапатах-1989 я быў адным з тых, хто нёс крыж...

Пасля школы Андрэй спрабаваў вучыцца ў РТІ...(Два разы.) Потым на хімфаку БДУ. Але так нідзе і не давучыўся, бо, як кажа, "у той час было шмат цікавейшых рэчаў".

Калі Савецкі Саюз развальваўся, Борману было проста неабходна адчуваць ход гісторыі літаральна на сваёй скуры. Таму, калі стала горача зусім побач, у Літве, дзе адбываліся масавыя мітынгі пратэсту, ён паехаў на барыкады "спыняць танкі". Праўда, танкі так і не сустрэў, бо жыў не на тых барыкадах: пад парламентам, у той час, як расійскія танкі накіраваліся да тэлецэнтра. Дарэчы, тыя літоўскія барыкады і абумовілі ў пэўнай ступені незвычайны імідж Андрэя (а-ля Шаміль Басаеў).

— Калі я паехаў у Вільнюс стаяць на барыкадах, дык даў сабе абяцанне, што пакуль Літва не атрымае незалежнасці — не буду галіцца. Літва атрымала. Тады падумаў, што неяк хутка ўсё атрымалася — нецікава, думаю: ну, пакуль Беларусь не стане незалежнай — не буду галіцца. Беларусь незалежнасць атрымала, толькі вось несапраўдная яна нейкая. Карацей, нейкія адгаворкі ўвесь час знаходзіліся...

Досвед самвыдату

Перабудова прынесла галоснасць і свабоду слова. Праз самвыдат, з якога нараджалася незалежная прэса, людзі мелі магчымасць даведацца пра тое, што хавала ад іх савецкая ўлада. Зрэшты, народ, згаладаўшыся па свабоднай, без ідэалагічных прымесяў інфармацыі, стараў добры попыт на самвыдат, што давала магчымасць і няблага на ім падзарабіць. Займаўся самвыдатам у свой час і Борман.

— Спачатку я толькі распаўсюджваў, потым ужо меў сваё ўласнае з сябрамі выдавецтва. Прызнаюся, што рабілі і бамбілі Маскву тонамі вельмі жоўтага самвыдату (адтуль і грошы былі). Што тычыцца Мінскага самвыдату, то ў канцы 90-х існавала прыватная газета "Беларуская трыбуна" — больш-менш якасная з журналісцкага погляду, але збольшага рускамоўная. Падавалася, што нядрэнная. Пасля з'явілася другое выданне — "Навіны БНФ" — журналістыка горшая, але больш партыйнай ідэалогіі. Рэдагаваў Алесь Суша. Я, дарэчы, працаваў у рэдакцыі ў 1990—1991-х, быў адказным сакратаром. Пасля з'явілася „Свабода" (Жук і Гермянчук). Там быў непараўнальна лепшы паліграфічны ўзровень, прафесійная журналістыка.

Кватэра Бормана і тамтэйшая багема

Праз сваю няўрымслівасць і актыўнасць Борман паспяваў паўсюль, што ў сваю чаргу захапляла і пэўным чынам нават натхняла людзей творчых. За пешы пераход чэшскай мяжы Борман атрымаў вершык ад Сокалава-Воюша. Паездкі ў Вільню з Лерай Сом скончыліся песняй ад яе. Праўда, што за песня, Борман так і не прызнаўся, сказаў, што інтымнага характару, таму "шукайце ў дыскаграфіі 1991 года". А "Пасядзелкі" на сутках з Пушкіным натхнілі апошняга на партрэт Бормана.

Пра сваю мінскую кватэру Андрэй узгадвае як пра месца з не вельмі добрай рэпутацыяй. Але затое там паспела перагасціць нямала вядомых асоб.

— "Ляпісы" ў мяне п'янствавалі амаль ў поўным складзе. N.R.M — па частках, Zyhimont Vaza таксама. І Памідораў, які, праўда, тады яшчэ не спяваў, да мяне праз акно лазіў.

Але, бадай, самая вядомая гісторыя, звязаная з Борманам, — гэта спаленне БССРаўскага сцяга, за які яго і пасадзілі на "Валадарку". Праўда, ён сцвярджае, што сцяг не паліў.

— Тую акцыю ладзілі анархісты. Мы прыйшлі на чужую акцыю. Севярын Кваткоўскі там панасіў яго вакол рэзідэнцыі, я павесіў на прыбіральню. Потым ужо сцяг спалілі, але мяне пры спаленні не было. Пасля прыехала міліцыя і ўсіх забрала. Я вярнуўся на месца злачынства — а там усіх забралі. Прыйшлося правакаваць і напрошвацца...

— Так хацелася, каб забралі?

— Ну, дык крыўдна: усіх забралі, а я недзе піва піў. Тады патрымалі трое сутак і выпусцілі пад падпіску аб нявыездзе. Потым мяне ўжо злавілі ў 1996-м, на Дзень Волі, і абвінавацілі ў спальванні сцяга. Вось тады я тры месяцы і прасядзеў на "Валадарцы", чакаючы суда. Далі мне два гады ўмоўна з адтэрміноўкай на год. Пасля гэтага я і вырашыў з'ехаць, бо мяне ўсё роўна за нешта б злавілі.

І ўсё ж гэта быў не адзіны выпадак затрымання. Борман ужо даўно паспеў прыцягнуць увагу мінскай міліцыі дзякуючы розным палітычным акцыям. Напэўна, нават цяжка будзе прыгадаць колькасць ягоных затрыманняў: міліцыя ўжо ведала хлопца ў твар...

— Шмат было розных выпадкаў. Неяк недалёка ад кафедральнага сабора ў Мінску я з групай моладзі залез на каналізацыйную шахту. Так мы абвясцілі дзяржаўнасць (а вакол розныя масавыя беспарадкі з напалову разагнанага мітынгу). І старшына з Цэнтральнага РАУС асабіста ходзіць: „Грамадзяне, разыходзьцеся, не парушайце правапарадак. А вам, Рамашэўскі, — персанальна кажу — разыходзьцеся!" Ён добра ведаў мяне з папярэдніх затрыманняў, але на маладых гэта ўражанне зрабіла.

Таксама быў выпадак, калі ўзялі за пікет каля пракуратуры і пешкі канваіравалі ў РАУС, бо ехаць машынай я адмовіўся.

Піва, дзяўчаты і Беларусь

— Што больш любіш з алкаголю: піва ці больш цяжкія напоі, як, напрыклад, "Зуброўка", якую ты сёлета на "Басовішчы" мяняў на чэшскае піва?

— Зразумела, піва. "Зуброўку" — гэта я для жонкі, яна шмат піва не вып'е...

— А якая ў цябе стандартная порцыя — колькі куфляў?

— Адзін куфель на абед, другі вечарам. Ну, а калі піць пачынаем, то хто лічыць, асабліва пасля чацвёртага...

— А як дзяўчаты ставіліся да твайго "барадатага" іміджу? Не палохаліся?

— Кагосьці адпуджвала, а кагосьці не. Тыя, каго адпуджвала, мяне не цікавілі. Так што вельмі якасны фільтр атрымаўся...

— Па чым адчуваеш настальгію?

— Я ў Еўропе паўсюль як дома. Калі мне чагосьці з Беларусі бракуе — замоўлю. Калі трэба будзе з'явіцца асабіста — з'яўлюся.

— Якія былі першыя адчуванні, калі наведаў Беларусь ужо з чэшскім пашпартам?

— Першым адчуваннем была небяспека, але гэта хутка прайшло. Прайшоўся па знаёмых месцах... Штосьці засталося як і 10 гадоў таму, а штосьці ўжо сёння не пазнаць.

— Чым для цябе сёння з'яўляецца Беларусь — няспраўджаная мара, чужая краіна, "родина-уродина"?

— Свая краіна з чужым насельніцтвам. Але яно зменіцца. Пройдзе пару генерацый, і змагу спакойна на пенсію сюды ехаць.

— Верыш?

— Не веру — ведаю.

Вольга ДУДКО.

ДА ВЕДАМА

Партыя аматараў піва была створана ў Мінску ў 1993 годзе. Дзейнасць партыі была часова прыпынена рашэннем Цэнтральнага каардынацыйнага камітэта ПАП яшчэ ўвосень 1996 года. Хаця афіцыйна дзейнічала да 1997 года, пакуль не была зачынена рашэннем Міністэрства юстыцыі.

Колькасць сяброў у 1995 годзе складала прыблізна 2500 чалавек. Сярод сяброў партыі можна сустрэць шмат вядомых асоб, дзеячаў мастацтва, палітычных актывістаў — мастака Міхала Анемпадыстава, музыку Сяргея Скрыпнічэнку (Zygimont Vaza), Лявона Вольскага (N.R.M.), журналіста Севярынца Кваткоўскага, лідэра Свабодных прафсаюзаў Генадзя Быкава, старшыню Беларускай партыі свабоды Сержука Высоцкага і іншых.

З'езды партыі:

Першы з'езд — Заснавальны — 10 жніўня 1993 г.
Другі з'езд — Праграмны — 3—4 верасня 1994 г.
Трэці з'езд — Перадвыбарны — 1995 г.
На 2013 год запланаваны наступны з'езд — Адраджэнне.

АДУСЮЛЬ

Прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес сеў за руль аднаго з аўтамабіляў МАЗ, якія былі пастаўлены з Беларусі

На шматтонным грузавіку Чавес аб'ехаў нафтахімічны комплекс, які будуецца ў штаце Карабоба, і застаўся задаволеным прадукцыяй беларускага завода. Прэзідэнт Венесуэлы адзначыў, што "МАЗы ні ў чым не саступаюць грузавікам вядомых замежных фірм, а іх кошт удвая ніжэй". Ён таксама паведаміў аб планах будаўніцтва зборачнага прадпрыемства Мінскага аўтамабільнага завода ў Венесуэле.

На вучэнні «Восень-2008» у войска выклікалі больш за 2 тысячы «партызанаў»

Больш за 2 тысячы ваеннаабавязаных выклікалі на зборы ў сувязі з чарговымі вучэннямі Узброеных сіл Беларусі "Восень-2008".

Як паведамляе сайт Міністэрства абароны, усе выкліканыя запаснікі прайшлі ўжо медыцынскі агляд і цяпер пастаўленыя на ўсе віды забеспячэння. З "партызанамі" праводзяцца заняткі па стральбе і кіданні гранат.

Аператыўныя вучэнні пройдуць з 15 па 21 кастрычніка. Запаснікі прымуць удзел у тактычных вучэннях з баявой стральбой і тактыка-спецыяльных вучэннях у складзе воінскіх частак і падраздзяленняў.

Расійскія навукоўцы даследуюць паселішчы беларусаў на Паўночным Каўказе

Група расійскіх навукоўцаў-этнографаў з Санкт-Пецярбурга рыхтуе экспедыцыю на Паўночны Каўказ. У Пяцігор'і, Адыгеі і Краснадарскім краі яны будуць даследаваць міжнацыянальнае суіснаванне розных этнічных груп. Сярод іншага, навукоўцы маюць намер даследаваць паселішчы, у якіх жылі беларускія сяляне, колішнія перасяленцы з Беларусі і іх нашчадкі.

Як адзначае інфармацыйнае агенцтва Regnum, экспедыцыя стартуе вясной 2009 года, а ў панядзелак на Паўночны Каўказ выправіцца група спецыялістаў, што мусіць правесці разведку і вызначыць маршрут экспедыцыі.

Жыхара Гомеля прыгаварылі да расстрэлу за гвалт і забойства школьніка

26-гадовы жыхар Гомеля асуджаны да расстрэлу за гвалт і забойства 9-гадовага хлопчыка. Такое рашэнне прыняў Гомельскі абласны суд, паведамляе БелаПАН.

Здарэнне адбылося ў верасні мінулага года. Знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення, злачынца падманам завёў школьніка ў лясны масіў у Гомельскім раёне, дзе згвалціў і забіў дзіця.

Дарэчы, падчас следства высветлілася, што ён ужо прыцягваўся да суда за дзеянні сексуальнага характару ў адносінах да малалетняга.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Збілі, а потым папрасілі прабачэння

Суд Цэнтральнага раёна Гомеля прыгаварыў двух 20-гадовых мясцовых жыхароў, якія збілі актывіста Ігара Случака, да 2,5 года абмежавання волі без накіроўвання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Згодна з матэрыяламі крымінальнай справы, маладыя людзі "без прычыны, з хуліганскіх намераў, наўмысна, груба парушаючы грамадскі парадак, дэманструючы сваё грэбаванне да навакольных і праяўляючы п'яную ўдаласць" збілі Ігара Случака. Яму былі нанесены лёгкія цялесныя пашкоджанні. Абвінавачаныя па прыгаворы суда павінны таксама выплаціць пацярпеламу 3 млн рублёў маральнага ўрону.

Актывіст маладзёжнага дэмакратычнага руху І.Случак з'яўляецца студэнтам Тартускага універсітэта (Эстонія), у Гомель прыязджаў на канікулы і браў актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі ў дэпутаты парламента Васіля Палякова. 27 ліпеня ў дыскаклубе "Красная жара" яго збілі два маладыя чалавекі. І.Случак быў шпіталізаваны з траўмамі твару, па факце хуліганства ён звярнуўся ў міліцыю. На судовым пасяджэнні хуліганы поўнасцю прызналі сваю віну і папрасілі прабачэння ў І.Случака.

"У частцы кампенсацыі маральнага ўрону я поўнасцю задаволены прыгаворам, — зазначыў у інтэрв'ю БелаПАН І.Случак. — У частцы прыгавору суда, што тычылася санкцыі за злачынствы, я як чалавек пацярпелы ад злачынства хацеў бы, каб гэтыя асобы атрымалі больш суровае пакаранне. Але як юрыст я разумею, што дадзенае рашэнне правільнае, бо пазбаўленне волі іх не выправіла б. Магчыма, будзе станоўчы эфект ад прымянення больш мяккага пакарання, хоць сам я сумняваюся, што гэты прыгавор акажа на іх станоўчы ўплыў".

Актывіст лічыць, што ў дадзенага злачынства хутчэй за ўсё адсутнічае палітычная падаплёка.

Алена ГЕРМАНОВІЧ, БелаПАН.

ТРАГЕДИЯ

Водитель наехал на группу подростков

Пять подростков пострадали в результате ДТП в городе Ветка Гомельской области.

34-летний водитель, управляя автомобилем "Жигули", совершил наезд на подростков -- 14-летнюю девочку и ребят 16, 13, 12, 11 лет, которые двигались по краю проезжей части. Все местные жители.

После ДТП пострадавшие были доставлены в больницу (двое из них в тяжелом состоянии -- в реанимации), где позднее 11-летний мальчик от полученных травм скончался. Водитель с места происшествия скрылся, но спустя два часа был задержан в результате введенного плана "Перехват".

ПАМЯЦЬ

І праз 65 гадоў жах ад той трагедыі не праходзіць

З 21 па 23 кастрычніка ў сталіцы адбудуцца мерапрыемствы, прысвечаныя 65-годдзю знішчэння Мінскага гета. Пра гэта паведаміў старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання былых вязняў гета і нацысцкіх канцлагераў Міхаіл Трэйстэр.

У ліку мерапрыемстваў Л.Трэйстэр назваў жалобны мітынг каля мемарыяла "Яма" (21 кастрычніка, 12.00, вул.Заслаўская), сход грамадскасці (21 кастрычніка, 18.00, канцэртная зала "Мінск"), адкрыццё памятнага знака на месцы знішчэння больш за 5 тыс. яўрэяў (22 кастрычніка, 10.00, вул.Сухая, былыя яўрэйскія могілкі), адкрыццё мемарыяльнага знака ў памяць аб дэпартаваных і знішчаных яўрэях нямецкага Кёльна (22 кастрычніка, 11.00, вул.Сухая, былыя яўрэйскія могілкі), міжнародны навуковы сімпозіум "Вывучэнне гісторыі Халакоста ў Германіі і Беларусі" (22 кастрычніка, 14.00, ММАЦ імя Й.Рау, праспект Газеты "Правда", 11), адкрыццё памятнага знака на месцы знішчэння больш за 14 тыс. яўрэяў ва ўрочышчы Тучынка (23 кастрычніка, 9.30, вул.Берута ў раёне Кальварыйскіх могілак) і пасяджэнне "круглага стала" па праблемах вывучэння і захавання памяці аб Халакосце (23 кастрычніка, 10.30, Мінскі яўрэйскі абшчынны дом, вул. В.Харужай, 28).

Як паведаміў М.Трэйстэр, да ўдзелу ў мерапрыемствах запрошана больш за 200 гасцей. Сярод іх — прадстаўнікі яўрэйскіх міжнародных арганізацый і замежных яўрэйскіх абшчын, дзяржаўных структур Беларусі, рэлігійных аб'яднанняў краіны і дыпламатычнага корпуса.

Марат ГАРАВЫ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

Виктор ГОНЧАРЕНКО, главный тренер БАТЭ

«Все сидели, словно опешив, притихшие»

— Наверное, никто из читателей не обидится, если главную благодарность адресую все же тем, кто болел за нас на стадионе. Клич "Вперед, Борисов!", которым нас поддерживали с первых минут, — это было потрясающе!

В ночь после матча удалось увидеть большую его часть в трансляции по российскому каналу "Спорт" в приятном сопровождении Романа Трушечкина. Этот комментатор был хорошо готов к репортажу. При этом, в отличие от коллег с другого канала, работавших на нашей встрече с "Реалом", не коверкал фамилии наших игроков. На таком фоне неточное "борисовцы" вместо принятого у нас "борисовчане" воспринималось как забавный конфуз.

Из реакции на матч делаю вывод, что он понравился многим. Особенно первые 25 минут в исполнении БАТЭ. Никто не ожидал, что мы сможем так сыграть. Если начистоту, для меня это тоже было шоком. Команда удивила тем, что не просто держалась на скоростях "Ювентуса". Ведь моментами мы гостей заметно превосходили.

Не подумайте вдруг, что ребята заиграли так по наитию или даже вопреки нашим ожиданиям. Напротив, команда делала все именно так, как мы планировали. Но ведь понятно, что планы и их воплощение редко совпадают. Особенно при встречах с соперниками такого ранга. Были опасения, что нам удастся не все. Но игра доказала, что в жизни нет ничего невозможного.

Мы не перевернули мир с ног на голову. Но представления о футбольной реальности в глазах многих изрядно подкорректировали. Оказывается, можно и с "Юве" держаться на равных, создавая ему большие проблемы в обороне. Туринцы в пяти матчах сезона до приезда в Минск пропустили всего два мяча. А мы забили им столько за один тайм. И имели возможности сделать это еще.

Главным пожеланием команде было сыграть активно. Сколько раз убеждался: глубокая оборона чревата сильным давлением на защиту и вратаря. Проигрывается подбор. К атакам соперника постоянно подключаются крайние защитники. Наступление накатывает волна за волной. Чтобы избежать этих проблем, постарались передвинуть игру на чужую половину. И, считаю, это вполне удавалось в те самые стартовые 25 минут.

У нас очень молодая команда. Нехайчику и Сивакову — по 20 лет, Ржевскому, Мирчеву, Пехе — по 21, Кривцу, Володько — по 22, Стасевичу — 23, Родионову — 25. Для меня важно, что у всех этих парней отменное здоровье. Им есть куда расти. У них похвальное желание прогрессировать, играть в более сильных чемпионатах. Читаю это в их глазах и поведении. В этом смысле работать с командой совершенно легко.

Когда повели 2:0, сразу подумал: теперь главное — не испугаться этих цифр, не прижаться к своей штрафной. Но, кажется, немного стушевались. И сразу появилась острота у наших ворот. В ответ не переставали идти вперед. Но к перерыву перевес в мячах упустили.

По этому поводу кое-кто даже позволил себе критику в наш адрес. Наверное, заслужили. Но давайте посмотрим на ситуацию под иным углом. Получить такой удар на последних секундах тайма, а потом не сломаться и выстоять — это тоже закалка, признак зрелости. И неоценимый опыт. Вспомните, как в последнем туре чемпионата России в Самаре такой "гол в раздевалку" рассыпал игру московского "Динамо" — но так ведь там "Крылья" не сравняли счет, а только сократили разрыв.

Дорога в раздевалку на минском стадионе довольно далека. Этого пути на перерыв хватило, чтобы коренным образом изменить свое настроение. Да и содержание того, что намеревался сказать. Первым порывом было с порога пообщаться на повышенных тонах, выговорить виновным в двух непростительных ошибках на последних минутах, из-за которых, собственно, и пропустили второй гол. А потом подумал: какой в этом смысл? Мы столько раз разбирали схожие ситуации, возникающее при выгодном нам счете. Ребята и так все прекрасно поняли.

Кстати, раздевалка в перерыве показалась не такой, как всегда. Обычно, когда туда входишь, уже в разгаре обсуждение игры, общение с доктором и массажистами. А на этот раз все сидели, словно опешив, притихшие. По обыкновению, сказал совсем немного. Убедились, какая игра нам удавалась и может принести успех? Давайте, несмотря ни на что, продолжать в том же ключе. "Ювентус" можно побеждать.

Я и сам впервые в моей практике к свистку на перерыв чувствовал себя совершенно опустошенным. Эмоций уже не было. Остался только холодный рассудок. И это даже помогло. Голова работала, как компьютер: как усилить игру, какие сделать для этого перестроения. И, поверьте, ни разу не возник соблазн подумать о сохранении счета. Считаю, мы и во втором тайме ни в чем сопернику не уступили.

Этой задачей определялась и логика замен. Две первые были направлены на усиление атакующей игры. Работала все та же посылка: держать в напряжении защиту "Юве". Особенно хорошо это удалось Сивакову. Миша настойчиво цеплялся за мяч...

Накануне игры мы переживали, что "Динамо" может не заполниться. Это был первый опыт распространения билетов на такой матч. И избежать недовольства и обид не удалось. Но, к счастью, на трибунах был аншлаг. А мы подарили праздник не только стадиону, но всей своей стране. Да и тем, кто болеет за нас за границами Беларуси. А это главное. Ведь радости у людей в теперешние времена случаются нечасто.

Утром перед матчем почувствовал, что психологически команда к игре готова, не напряжена. Было обычное состояние — как перед туром чемпионата страны. Не знаю, из чего сложилось это великолепное настроение. Может, сказалась привычная обстановка клубной базы. Никто нам там не докучал. Даже журналисты все силы бросили на встречу и сопровождение "Ювентуса". Нас это задевало. Но постарались и такое обстоятельство использовать как фактор мотивации.

Путь из Дудинки на "Динамо" неблизкий — 90 километров. Впрочем, мы всегда так добираемся с базы на выездные матчи со столичными командами. Да и живут все ребята в Минске — дорога знакома. Но особое настроение создавали даже милицейские машины, которые, меняясь, сопровождали нас до стадиона. Вдоль трассы стояли автобусы с нашими болельщиками. И мы поразились, как их много. Команда словно собирала боевое настроение с обочин этой дороги. Мы вдруг почувствовали, насколько необычные и важные события происходят в нашей жизни.

А потом был стадион с его неповторимым лигочемпионским антуражем. И это только добавило вдохновения, но отнюдь не напряжения. По-моему, удалась нам и установка.

Кстати, часто спрашивают, какую тактическую схему мы применяем, два у нас нападающих или один. Для меня это абсолютно не принципиально. Вы, к примеру, заметили умение Сергея Кривца оказываться в разные моменты в разных ролях? Вспомните, как он открылся, когда забивал первый гол. Или какую передачу из глубины сделал Виталику Родионову на первых минутах. Никогда не определяю расстановку цифровым кодом: 4-4-2 или 4-2-3-1. Просто на каждый матч ставлю конкретные задачи каждому футболисту.

Вас, конечно же, интересует, как вели себя ребята и что говорили после игры. К сожалению, меня торопили на пресс-конференцию. И много интересного, наверное, пропустил. Но об одном эпизоде расскажу с удовольствием. Иван Пеха, наш молодой словацкий легионер, в БАТЭ совсем недавно. Он поиграл на родине и в Румынии. Не был там на видных ролях. Но у парня высочайший профессионализм. Стараюсь объяснить, почему пока он играет нечасто. Ему нелегко это принять. Но после игры с "Юве" он подошел и негромко сказал: "Спасибо, тренер..." Два слова игрока, который провел на поле всего несколько заключительных минут. Очень важные для меня два слова. В них прозвучало так много...

До следующего матча Лиги чемпионов почти три недели. Что сейчас главное? Выбросить из головы и "Ювентус", и "Зенит". В воскресенье играем в чемпионате страны против минского "Локомотива". После этого нам останется провести шесть матчей, а соперникам — всего четыре. И должно стать предельно ясно, сколько очков нам необходимо будет набрать, чтобы снова стать чемпионами. Этой осенью по понятным причинам выиграть титул хочется как никогда.

Последний тур БАТЭ пропускал. Но при этом наши позиции заметно укрепились стратегически. Главный конкурент — МТЗ-РИПО — проиграл. Минское "Динамо" сыграло вничью. В то же время к ним подтянулся солигорский "Шахтер". Теперь он будет медально мотивирован перед встречами с нашими ближайшими преследователями.

Занятная осень...

Фото photo.bymedia.net

Виктор Михайлович Гончаренко

Главный тренер. Родился 10 июня 1977 года в Хойниках Гомельской области. Воспитанник хойникской ДЮСШ и столичного РУОРа (первые тренеры — Александр Леонидович Вергейчик, Юрий Антонович Пышник). Защитник. Выступал в РУОРе (1995—1997) и в БАТЭ (1998—2002). Двукратный чемпион Беларуси (1999, 2002), двукратный серебряный (1998, 2000) и бронзовый (2001) призер чемпионатов Беларуси. Игровую карьеру завершил из-за серьезной травмы. Образование — высшее. В 2004 году закончил БГАФК (специальность — тренер по футболу). С 2004-го по 2006 год работал тренером дублирующего состава БАТЭ. С 2007 года — старший тренер БАТЭ. Имеет лицензию УЕФА категории "А". С 13 ноября 2007 г. — главный тренер БАТЭ.

Вперед, БАТЭ! Вперед, Борисов!

Беларусь давно не видела такого футбола. Болельщики разных клубов, из разных городов страны в едином порыве неистовствовали на стадионе "Вперед, БАТЭ!", "Вперед, Борисов!". И наши парни своей игрой просто повергли в шок не только Беларусь, но и весь футбольный мир. Мы уже не верили, что такое возможно, но оказалось, что в футболе возможно все.

Как реагируют на свой новый статус те, кто в один день (даже вечер, а если точнее — за каких-то 90 минут) стали кумирами миллионов. Нам показалось интересным прочитать их интернет-дневники.

«Колотун испарился, когда началась игра»

Сергей КРИВЕЦ, полузащитник ФК БАТЭ, молодежной сборной Беларуси, кандидат в национальную сборную, "автор" первого гола:

— День после матча с "Юве" получается интересным. Гулял с мамой по Минску, подошел ко мне незнакомый парень и попросил автограф, сфотографировался, руку пожал, сказал спасибо. Я постоял, подумал, как это все приятно. Но потом понял: для того, чтобы такие вещи случались, надо много работать. Просто так ничего не происходит.

В среду два часа висел на телефоне. Сперва позвонили мне со Sports.ru, потом с гродненского радио. Третью газету я, если честно, уже и не помню. Когда обдумывал текст блога, снова зазвонил телефон. Оказалось — журналист "Спорт-Экспресса". Задавал мне много всяких разных вопросов: "Что вы чувствуете? Как вам это удалось?" Пока мы общались, я чего-то так завелся, что даже упрекнул его пару раз. Он все сравнивал наш чемпионат с российской второй лигой. А я ему сказал, что они наши фамилии неправильно пишут, перед началом группового раунда раздали нашим соперникам по шесть очков. Надеюсь, он хотя бы знает, что БАТЭ — команда из Беларуси, а не из Белоруссии.

Ладно, давайте о футболе. Мне не показалось, что стадион "Динамо" так уж изменился. Все, как раньше, просто везде развешены плакаты Лиги чемпионов. В общем, "Динамо" как "Динамо". Только много лоска. Другое дело — люди, которые пришли на стадион. Вот это было здорово! Классная, могучая поддержка очень порадовала.

Если честно, то перед "Реалом" волновался меньше. А вот перед "Ювентусом" такой на меня колотун напал, что трудно объяснить. Еще когда с базы выезжали, почувствовал, что мандраж присутствует. В автобусе я радио слушал. А там как раз ребята из Жлобина в студию дозвонились. Говорили, что заказали микроавтобус, всей компанией едут в Минск на футбол, надеются на успех. После этого понял, что игра наша с "Юве" — дело очень ответственное. Все-таки вся страна за нас болеет.

Колотун испарился, когда началась игра. Виктор Михайлович (*В.М.Гончаренко — главный тренер.* — **Ред.**) настраивал нас показать хороший футбол. Сказал, что нужно верить в себя и хотеть победы. Первые 30 минут были просто фантастическими. Мне очень понравилось, насколько мы быстро и уверенно действовали. И два гола забили заслуженно. Лихтарович сделал мне классную передачу. Времени, чтобы испугаться, у меня не было, ситуация не давала возможности подумать дважды. Смотрю, мяч под левой, понимаю, что бить будет неудобно, тогда я прокинул вратаря и покатил уже в пустые ворота. Маннингер повелся на мой финт... Я не знаю, что случилось бы, если бы в рамке находился Буффон. Может, мы бы больше забили? Ладно, в общем, все это теория.

Когда Стасевич сделал счет 2:0, столкнулись с проблемами. Первые 30 минут вообще не верилось, что у нас в соперниках команда уровня "Ювентуса". Забили им два, и не понимаем, что нам дальше делать. Опыта явно не хватило. А еще, наверное, уверенности. Поэтому и пропустили два гола в ответ.

В перерыве Михалыч сказал: "Забили два, так почему не можем забить и третий". Попросил, чтобы мы продолжили играть с такой же агрессией. И, как мне кажется, второй тайм мы хорошо провели. Не отбивались от атак соперника, а выглядели на уровне. И моменты были. Но мы их, к сожалению, не реализовали. Сейчас эмоции улеглись. Приходит в голову мысль, что могли выиграть. Но цели добиваться надо было на поле. И все-таки для нас ничья — очень даже неплохой итог.

Игроки "Ювентуса" — вполне земные люди. Больше всех я пересекался с Кьеллини. Интересный защитник. Станет сзади и толкает в спину. Потом он понял, что я на его провокации не реагирую, и успокоился. Веселый такой футболист, после игры подошел ко мне, руку пожал.

Пока вся команда продолжает жить остаточными эмоциями после "Ювентуса". Но это нам только в плюс. Это не те переживания, которые подсаживают на "звездочку". Сейчас хочется играть так же быстро и уверенно, сохранить кураж. Желания развиваться в профессиональном плане просто уйма.

Еще раз спасибо за поддержку. Удачи всем.

Кривец Сергей — полузащитник. Родился 8.06.86 в Гродно.

Предыдущий клуб — "Локомотив" (Минск).

Футбольная школа — ДЮСШ "Белкард" (Гродно).

Первый тренер — Владимир Павлович Семериков.

Двукратный чемпион Беларуси (2006, 2007). Обладатель Кубка Беларуси (2006). Включался в список 22 лучших футболистов чемпионата (2007). Член молодежной сборной Беларуси, кандидат в национальную сборную.

Виталий РОДИОНОВ, нападающий:

— По большому счету, мы могли, даже, думаю, должны были выиграть в этом поединке. Но обстоятельства сложились, увы, по-другому. У нас была установка провести первые минуты агрессивно. А потом все ребята почувствовали кураж и провели встречу в хорошем ключе. Однако я разочарован ничьей. Что касается моей игры, считаю, ничего особенного не показал. Должен был реализовывать моменты и выжимать максимум. Сегодня очень удивила поддержка зрителей. Когда доводилось смотреть с трибуны матчи сборной Беларуси, уровень боления был невысоким. А на этот раз команду действительно поддерживали, не было этих бестолковых дудений и болели организованно.

Павел НЕХАЙЧИК, полузащитник:

— Футбол — непредсказуемая игра. Но мы играли дома и должны были действовать с позиции силы. "Ювентус" произвел неплохое впечатление, понравился. Слабых соперников в Лиге чемпионов не бывает. Но если не считать, что с "Реалом" играли на выезде, а с туринцами дома, мне показалось, не в обиду "Ювентусу", что испанцы были на голову сильнее итальянцев.

Поэтому немного присутствует чувство разочарования. Тем более я сам мог отличиться, и команда выигрывала со счетом 2:0. Однако в раздевалке после матча положительные эмоции все-таки преобладали.

ГІСТОРЫЯ

Летапіс БАТЭ: ад Беларускай ССР да Лігі чэмпіёнаў УЕФА

Праз 35 гадоў пасля свайго заснавання футбольны клуб БАТЭ выйшаў у групавы этап Лігі чэмпіёнаў.

Гісторыя футбольнага клуба БАТЭ распачалася яшчэ за савецкім часам — у 1973 годзе заводская каманда дэбютавала ва ўсходняй зоне другой групы чэмпіянату Беларускай ССР. Упэўнена выйграўшы свой першы ў гісторыі сезон, барысаўчане атрымалі права выступаць у дывізіёне мацнейшых, а ў 1974 годзе выйгралі гэты турнір, стаўшы чэмпіёнам Беларускай ССР. Працягваючы слаўныя традыцыі, у 1976 годзе БАТЭ робіць залаты дубль — выйграе чэмпіянат Беларускай ССР і Кубак краіны. Потым - у 1979-м... А ў 1981 годзе каманда спыняе сваё існаванне.

Гісторыя БАТЭ аднаўляецца ў 1996 годзе, калі ініцыятыўная група вырашыла адрадзіць каманду. Галоўным спонсарам барысаўскай дружыны выступіла фірма "Сталкер", а яе генеральны дырэктар Анатоль Капскі быў выбраны прэзідэнтам футбольнага клуба. Пётр Альшэўскі стаў выканаўчым дырэктарам клуба, трэнерскі штаб узначаліў Юрый Пунтус. Пачаўся новы этап...

У гэтым жа годзе каманда дэбютавала ў нацыянальным першынстве Беларусі, выступіўшы ў падгрупе А другой лігі. Клуб перамог у 24 матчах з 27 і атрымаў права выступаць у першай лізе нацыянальнага першынства. Лепшым бамбардзірам турніру стаў нападаючы барысаўчан Мікалай Рындзюк, які забіў 28 галоў.

У наступным, 1997, годзе барысаўчане займаюць другое месца ў першай лізе чэмпіянату Беларусі і атрымліваюць права на выступленне ў элітным дывізіёне. Лепшым бамбардзірам турніру зноў становіцца Мікалай Рындзюк: на яго рахунку 30 забітых галоў.

У 1998 годзе барысаўскія футбалісты заваявалі сярэбраныя ўзнагароды першынства, а праз год яны сталі чэмпіёнамі краіны. Увогуле, за ўвесь час выступленняў у вышэйшай лізе чэмпіянатаў Беларусі БАТЭ не заставаўся без узнагарод. (Выключэннем стаў толькі 2005 год.) Пры гэтым яны чатыры разы выйгравалі званне чэмпіёна краіны (1999, 2002, 2006, 2007 гады). Дарэчы, неблагія чэмпіёнскія перспектывы ў барысаўчан ёсць і сёлета. Зараз каманда стаіць на першым месцы ў турнірнай табліцы.

Што да еўракубкавай гісторыі БАТЭ, то яна таксама багатая. Вопыт выступлення на міжнароднай арэне барысаўчане пачалі набіраць у сезоне 1999/2000. Тады ў межах кваліфікацыйнага раунда Кубка УЕФА беларусы саступілі маскоўскаму "Лакаматыву". У сезоне 2001/20002 у першым раундзе ўсё таго ж Кубка УЕФА беларусы саступілі грознаму італьянскаму "Мілану". Еўракубкавы сезон 2002/2003 стаў для барысаўчан стаў больш працяглым. Толькі дайшоўшы да трэцяга раунда Кубка Інтэртота, БАТЭ па суме матчаў саступіў італьянскай "Балоны".

Кранаючы тэму выступлення барысаўскага клуба ў Лізе чэмпіёнаў, нельга не прыгадаць мінулы год. Барысаўчане дайшлі да трэцяга кваліфікацыйнага раунда, дзе саступілі румынскай "Сцяуа".

Тое, што не ўдалося беларусам у мінулым годзе, стала рэальнасцю ў гэтым. У вырашальных сустрэчах БАТЭ перамог балгарскі "Леўскі". Гэтая перамога адкрыла дарогу ў асноўны раунд Лігі чэмпіёнаў. Сапернікі ў БАТЭ яшчэ тыя — мадрыдскі "Рэал", турынскі "Ювентус", піцерскі "Зеніт". Сапраўды, "зорныя каманды", і быць у адной кампаніі з імі вельмі пачэсна. А граць з імі на роўных — гэта ўвогуле мара ўсіх беларускіх балельшчыкаў, якая яшчэ нядаўна здавалася нязбыўнай. Але...

Безумоўна, акрамя саміх футбалістаў вялікую ролю ў поспеху БАТЭ адыграў і яго адраджальнік — Анатоль Капскі. Гэты чалавек беззапаветна адданы футболу і барысаўскай камандзе. Што да трэнераў, то з барысаўскай камандай у розныя часы працавалі Юрый Пунтус, Ігар Крывушэнка і Віктар Ганчарэнка. Менавіта маладому Віктару Ганчарэнку, якому зусім нядаўна споўнілася толькі 30 гадоў і які з-за сур'ёзнай траўмы быў вымушаны завяршыць гульнявую кар'еру, было наканавана вывесці барысаўчан у Лігу чэмпіёнаў.

Пасля нічыёй з турынскім "Ювентусам" наўрад ці хто зможа адказаць на пытанне, на што здольная каманда Ганчарэнкі. Але тое, што БАТЭ — сапраўдная зорка не толькі на беларускім, але і на еўрапейскім футбольным небасхіле, стала зразумела бадай што ўсім.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Пры падрыхтоўцы гэтага тэкста былі выкарыстаны матэрыялы, змешчаныя на афіцыйным сайце ФК "БАТЭ".

Хлопцы цаною ў 5 мільёнаў еўра

Эксперты SportBild правялі даследаванне, у выніку якога быў вызначаны кошт ігракоў кожнага клуба Лігі чэмпіёнаў.

Самай дарагой камандай прызнана "Барселона", сумарны кошт ігракоў якой складае 392 мільёны еўра. За ёю ідуць "Чэлсі" (390 мільёнаў) і "Манчэстэр Юнайтэд" (381 мільён).

Што тычыцца групы, у якой гуляе чэмпіён Беларусі БАТЭ, то ў ёй першы — "Рэал" (365 мільёнаў), за ім ідзе "Ювентус" (260 мільёнаў). У чэмпіёна Расіі — 140 мільёнаў. Натуральна, што беларускі БАТЭ, самы малады клуб Лігі, у гэтым рэйтынгу ідзе апошнім. Ігракі барысаўскай каманды ацэньваюцца ў 5 мільёнаў еўра.

Кошт усіх футбалістаў, якія змагаюцца за перамогу ў Лізе чэмпіёнаў, — 5,298 мільярда еўра.

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

Архіпелаг паэзіі



Выхад амаль што кожнай беларускай кніжкі ўважаю за свята.

Але як літаратару і выдаўцу мне асабліва да душы выданні і праекты, якія запаўняюць пэўныя нішы ў нашай культурніцкай прасторы. Важкі фаліянт "ГАЛАСЫ З-ЗА НЕБАКРАЮ: анталогія паэзіі свету ў беларускіх перакладах XX стагоддзя", несумненна, належыць да такіх праектаў. Аўтару ідэі і асноўнаму ўкладальніку паэту Міхасю Скоблу ўдалося наладзіць не проста свята, а грандыёзны паэтычны фэст.

Доўгачаканае выданне, прэзентацыя якога адбылася ў сталічным Палацы мастацтва, папраўдзе ўражвае. З цяжкасцю верыцца, што не цэлы акадэмічны інстытут, а фактычна адзін чалавек (!) здолеў укласці 896-старонкавую (практычна фармата А4!) анталогію. Гэта ж колькі трэба было перачытаць, узважыць, ацаніць і адабраць, каб у выніку прадставіць чытачу больш за паўтары тысячы твораў 658 паэтаў з 42 краін у перастварэннях 198 айчынных перакладчыкаў! А калі дадаць яшчэ аўтарскія каментары і біябібліяграфічныя нататкі, а таксама 114 фотаздымкаў, большасць з якіх друкуюцца ўпершыню?

Здымаю, як кажуць, свой капялюш!

Парадавацца разам з укладальнікамі незвычайнай аўтарскай анталогіі сабралася шматлікая аўдыторыя прыхільнікаў прыгожага. Паводле сцэнарыя, творы нацыянальных паэтаў чыталі на іх родных мовах некаторыя прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса ў Беларусі, а беларускія перастварэнні шэдэўраў сусветнай літаратуры -- самі нашы перакладчыкі. Своеасаблівыя творчыя тандэмы ўтварылі амбасадар Латвіі Майра Мора і Сяргей Панізьнік, амбасадар Ізраіля Зееў Бен-Ар'е і Міхась Скобла (ён чытаў узнаўленне Рыгора Крушыны), амбасадар Вялікабрытаніі Найджэл Гулд-Дэвіс і Марына Казлоўская, амбасадар Украіны Ігар Ліхавы і Анатоль Вярцінскі, які прадставіў пераклад Ніны Мацяш, амбасадар Швецыі Стэфан Эрыксан і Зміцер Занеўскі. Гучалі неўміручыя радкі Яна Райніса, цара Саламона, Уільяма Шэкспіра, Тараса Шаўчэнкі, Сціга Ларсана.

Потым слова бралі аўтар прадмовы літаратуразнаўца Ева Лявонава, навуковы рэдактар анталогіі і адзін з яе перакладчыкаў Лявон Баршчэўскі, выдавец Марына Шыбко... Прамаўлялі аб прэзентаваным выданні, дэкламавалі паэты і перакладчыкі Алесь Разанаў, Марыя Мартысевіч, Леанід Дранько-Майсюк, Андрэй Хадановіч. Далучыўся да іх мастак і паэт Рыгор Сітніца, які ўдала сыграў ролю маршалка вечарыны, не забываючыся ўлагодзіць велешаноўную публіку і музычнымі нумарамі, якія віртуозна сыграў струнны квартэт "Класіка".

"Галасы з-за небакраю" -- своеасаблівы працяг гэткага ж важкага тома "КРАСА І СІЛА: анталогія беларускай паэзіі XX стагоддзя", які пабачыў свет пяць гадоў таму дзякуючы карпатлівай і самаахвярнай працы таго ж Міхася Скоблы.

І за першы, і за другі фаліянт вялікая падзяка яму і выдавецтву "Лімарыюс", фундатарам і дабрадзеям, дызайнеру Генадзю Мацуру і ўсім тым, хто спрычыніўся да іх выхаду, хто адкрыў яшчэ дзве прыўкрасныя выспы архіпелага беларускага прыгожага пісьменства.

Уладзімір СІЎЧЫК.

CINEMA

Спяшайцеся бачыць!

У Музеі гісторыі беларускага кіно пачаўся паказ рэтрапраграмы "Кінаюбіляры 2008 года". У праграму ўключаны лепшыя фільмы славутых рэжысёраў сусветнага кіно.

10 кастрычніка будзе паказана карціна "Вялікія надзеі" (Вялікабрытанія, 1946 г.) Дэвіда Лініа, 15 кастрычніка — фільм "Мой дзядзечка" (Францыя—Італія, 1958 г.) Жака Таці. 17 кастрычніка праграму працягне фільм "Крыжакі" (Польшча, 1960 г.) Аляксандра Форда, 22 кастрычніка — "Карабель дурняў" (ЗША, 1965 г.) Стэнлі Крамера, 24 кастрычніка — "Калі+" (Вялікабрытанія, 1968 г.) Ліндсэя Андэрсана, 29 кастрычніка — "Дзета" (Францыя — Алжыр, 1965 г.) Коста-Гаўраса, 31 кастрычніка — "Нож у вадзе" (Польшча, 1962 г.) Рамана Паланскі. Усе паказы праходзяць па серадах і пятніцах у 15.00 і 18.30.

Апрача таго, у музеі арганізаваны спецыяльны паказ. Да 90-годдзя з дня нараджэння рэжысёра Інгмара Бергмана будуць паказаны яго карціны: "Маўчанне" (11 кастрычніка) і "Фані і Аляксандр" (18 кастрычніка). Да 80-годдзя з дня нараджэння рэжысёра Стэнлі Кубрыка ў музеі пройдуць паказы: 25 кастрычніка — карціны "Доктар Стрэйнджлаў, або Як я навучыўся не хвалявацца і палюбіў бомбу", 1 лістапада — "2001: Касмічная адысея", 8 лістапада — "Бары Ліндан".

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

Падарунак Беларусі ад роду Радзівілаў

Прадстаўнікі магнацкага роду Радзівілаў перадалі Беларусі матэрыялы па гісторыі сваіх продкаў.

Перадача адбылася ў Варшаве падчас сустрэчы пасла Беларусі ў Польшчы Паўла Латушкі з польскімі прадстаўнікамі роду Мацеем і Каралем Радзівіламі. Яны перадалі два арыгінальныя прыжыццёвыя гравюрныя партрэты XV і XVI стагоддзяў Януша і Мікалая Радзівілаў. Гравюры набыў Мацей Радзівіл на аўкцыёнах у Германіі. Акрамя таго, былі перададзены лічбавая копія партрэта Барбары Радзівіл і актуалізаванае генеалагічнае дрэва роду Радзівілаў. Нашчадкі Радзівілаў выказалі жаданне ўбачыць гэтыя падарункі ў адноўленым Радзівілаўскім замку ў Нясвіжы.

СКАЖЫ, ВІТАЛЬ...

За мяжу — без запазычанасцяў перад законам

Падкажыце, калі ласка, ці можа непагашаны штраф за нявыплату падаткаў перашкодзіць выезду за мяжу Рэспублікі Беларусь?

Сяргей Кныш, Магілёў.

— Так, можа. Згодна з дзеючым заканадаўствам, права на выезд за межы краіны можа быць часова абмежавана ў шэрагу выпадкаў. Адным з такіх выпадкаў якраз і з'яўляецца наяўнасць неаплачаных штрафаў, накладзеных на чалавека судом. Абмежаванне здымаецца адразу пасля таго, як судовае рашэнне выканана.

Дарэчы, у выпадку ад'езду за мяжу на пастаяннае месца жыхарства чалавек абавязаны прадаставіць даведку, што ён поўнасцю разлічыўся з бюджэтам, заплаціў усе падаткі і іншыя абавязковыя плацяжы і прымененыя санкцыі (калі такія былі). Без наяўнасці даведкі з інспекцыі Міністэрства працы па падатках і зборах аб адсутнасці запазычанасці нават заява аб выездзе за мяжу на пастаяннае месца жыхарства прынята не будзе.

Пры розным паходжанні — розныя правы

Мая сваячка — грамадзянка Украіны. Сёлета яна заканчвае сярэднюю школу і збіраецца пераехаць у Беларусь, дзе хоча паступіць у ВНУ. Падкажыце, на якіх умовах яна будзе паступаць у ВНУ?

Алена Яцкевіч, Гомель.

— Калі ваша сваячка — грамадзянка Украіны, то яна можа паступаць у вышэйшую навучальную ўстанову як грамадзянка іншай дзяржавы на ўмовах аплаты. Калі ж яна асоба беларускай нацыянальнасці (адзін з бацькоў — беларус, што пацвярджаецца пасведчаннем аб нараджэнні), то нават калі яна з'яўляецца грамадзянкай Украіны і пражывае на тэрыторыі суседняй дзяржавы, то ўсё роўна мае такія ж самыя правы, як і грамадзяне Беларусі. Іншымі словамі, можа ўдзельнічаць у конкурсе на атрыманне вышэйшай адукацыі за кошт рэспубліканскага бюджэту.

Хачу адкрыць разліковы рахунак

Што трэба для таго, каб фізічнай асобе дазволілі адкрыць банкаўскі рахунак?

Людміла Раманава, Мінск.

— Для пачатку неабходна прыйсці ў любое банкаўскае аддзяленне. Беларускія банкі практыкуюць адкрыццё фізічным асобам разліковых банкаўскіх рахункаў як у беларускіх рублях, так і ў замежнай валюце. Разліковы рахунак адкрываецца для залічэння паступаючых на адрас фізічнай асобы фінансавых сродкаў.

Толькі майце на ўвазе: адкрыццё фізічным асобам разліковых банкаўскіх рахункаў ажыццяўляецца, як правіла, пры прадастаўленні дакументаў, якія пацвярджаюць асобу чалавека, які пажадаў адкрыць гэты самы рахунак. Ананімнасць у гэтай справе не практыкуецца.

Ці маю я права не пагадзіцца на перавод?

Я працую ў прыватнай фірме. Начальнік вырашыў перавесці мяне на новую пасаду, але заробак будзе меншым. Падкажыце, ці магу я не пагадзіцца на перавод?

Святлана Корзун, Мінск.

— У Працоўным кодэксе на гэты конт напісана: "У сувязі з абгрунтаванымі арганізацыйнымі альбо эканамічнымі прычынамі наймальнік мае права змяніць істотныя ўмовы працы работніка". Але ёсць абавязковая ўмова: работнік павінен працягваць працу па той спецыяльнасці, кваліфікацыі альбо на пасадзе, якія вызначаны ў працоўным дагаворы.

Істотнымі ўмовамі працы прызнаюцца сістэма і памер аплаты працы, гарантыі, рэжым працы, разрад, найменне прафесіі, пасады, устанаўленне альбо адмена няпоўнага працоўнага часу, сумяшчэнне прафесій і іншыя ўмовы.

Акрамя таго, наймальнік абавязаны папярэдзіць супрацоўніка аб змяненні істотных умоў працы ў пісьмовай форме не пазней, чым за адзін месяц.

Пры адмове супрацоўніка ад працягу працы ў сувязі са змяніўшымися ўмовамі працы працоўны дагавор спыняецца.

Свае пытанні ў рубрыку дасылайце на адрас: 220030, Мінск, вул.Энгельса 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля" з паметкай "Скажы, Віталь...".

Вядучы рубрыкі Віталь ГАРБУЗАЎ.

ПОСТАЦІ

Яго і сцены слухалі

Знанаму мовазнаўцу і педагогу Фёдару Янкоўскаму было б 90

Не раз, помніцца, калі Фёдара Міхайлавіча ўхвалялі за яго незвычайны дар захапляць прадметам сваёй размовы любую аўдыторыю, ён па-дзіцячы непасрэдна і радасна пагаджаўся: "Так, мяне і сцены слухаюць..." І ў гэтым не было нават адцення нейкай позы, пыху, красавання. А толькі — усведамленне добра зробленай справы, годнасць творцы, які спаўна ўкладае ў яе і душу, і найбагацейшыя веды, і шматгранны талент.



Ганаруся сваім сяброўствам з гэтым найвыдатнейшым, найстараннейшым аратым на ніве беларускай культуры. Знаны філолаг, педагог, аўтар шматлікіх даследаванняў і кніг аб чароўных скарбах роднай мовы, ён быў бездакорным аўтарытэтам не толькі ў асяродку навуковай і творчай нацыянальнай інтэлігенцыі, а і сярод вучняў, чытачоў і слухачоў, хто хоць раз дакрануўся да духоўнай скарбонкі Фёдара Янкоўскага.

Яго ведалі і паважалі не толькі ў Беларусі. Многія імкнуліся з ім сустрэцца, пагутарыць, далучыцца да дзівоснай красы беларускай мовы. У маім архіве — нямала памятных здымкаў, дзе навуковец то побач з вядомым нямецкім славістам Карлам Губшмітам, то з дзядзькам Юзікам — братам Якуба Коласа, з іншымі цікавымі людзьмі. Ён і сам быў з той самай пароды.

Балюча, што Фёдара Міхайлавіча ўжо няма. Да апошняга, адольваючы нездароўе, ён працаваў, працаваў, працаваў. Запомнілася, як рыхтавалі з ім (я быў тады на тэлебачанні) чарговы выпуск тагачаснага тэлечасопіса "Роднае слова". Як жа ён стараўся данесці і перадаць гледачам сваю любоў да гэтага слова, і гэта знаходзіла ўдзячны водгук. А пра непараўнальнае лекцыйнае майстэрства Педагога з вялікай літары і зараз згадвае з захапленнем былая студэнтка політэхнічнага інстытута Тамара Курленка. Ды хіба яна адна? Пра яго непасрэдных выхаванцаў — будучых філолагаў — і казаць няма чаго. Кніга любімага настаўніка "Само слова гаворыць" — настольная для іх і іх дзяцей.

...Фотамастак Анатоль Каляда аднойчы падлавіў момант, калі Фёдар Міхайлавіч, выйшаўшы з дому, запыніўся на хвілінку ў спакойным і мудрым "восеньскім" одуме. Агонь няўрымслівай натуры стоены дзесьці ў глыбіні душы, яго водсвет прабіваецца ў ледзь прыкметнай усмешцы... Я вельмі люблю гэты надзвычай характэрны здымак. На ім — мой дарагі сябра, якім ён быў, якім застанецца ў сэрцы...

Уладзімір СОДАЛЬ.

Міхаіл СЯМЁНАЎ:

«Дзяўчын, якія паляць, — прашу мяне не турбаваць»

Трансляцыю алімпійскіх схватак Міхаіла Сямёнава мы глядзелі ледзьве не ўсёй рэдакцыяй. Ведаючы, які няпросты шлях давялося прайсці Міхаілу для таго, каб усё ж такі патрапіць на барцоўскі дыван Пекіна, нам вельмі хацелася, каб Сямёнаў выйграў медаль, даказаўшы сабе і ўсім "добразычліўцам", што насамрэч на многае варты. Справядлівасць у рэшце рэшт перамагла.



У Мінск Сямёнаў вярнуўся сапраўдным трыумфатарам пекінскай Алімпіяды...

"У нас ёсць хвілін 15—20, бо трэніроўка чакаць не будзе", — з гэтай фразы бронзавага прызёра Алімпійскіх гульняў распачалася наша з Мішам размова...

— Увогуле, я вельмі люблю трэніравацца, — прызнаецца ён. — Без барацьбы не ўяўляю сябе. Шчыра кажучы, у дзяцінстве я чым толькі не спрабаваў займацца. Хадзіў у футбольную секцыю, але ў рэшце рэшт выбраў барацьбу. А ў барцоўскую секцыю я прыйшоў сам — без бацькоўскай падказкі. Як паказаў час — я не памыліўся.

— Міша, адкажы шчыра: думка кінуць барацьбу ніколі не ўзнікала. Маю на ўвазе псіхалагічны ціск, які на цябе аказвалі. Не вельмі ж прыемна чуць, што ты "нулявы"...

— Прыемнага, канечне, мала. Але я прыйшоў займацца барацьбой не для кагосьці, а для сябе. Я проста стараўся не чуць папрокі ў свой адрас ад розных "добразычліўцаў". Барацьба такі від спорту... Карацей, не цукар... Гэта — кроў, пот, слёзы і траўмы... І калі ты хочаш нечага тут дасягнуць, то трэба быць моцным не толькі фізічна, але і псіхалагічна...

— Мара любога спартсмена — выступленне на Алімпіядзе. Ты яе ажыццявіў. Падзяліся ўражаннямі...

— Цяжка гэта ўсё. Апошнія дзевяць месяцаў перад Алімпіядай былі самымі цяжкімі. Увесь гэты час займалі зборы і спаборніцтвы. Дома бываў вельмі рэдка. Калі набярэцца месяца паўтара, то і добра.

Што да Алімпіяды, то гэта, канечне незабыўнае свята. У Пекіне сабралася ўся спартыўная эліта планеты. Людзі прыехалі за медалямі. Барцоўскі турнір быў вельмі напружаным. Калі так можна выказацца, то спартсмены дзейнічалі па прынцыпе: "Пачуў пах крыві — душы ахвяру". Гэта толькі ў тэлетрансляцыях схваткі прыгожа падаюцца. А на дыване такое часам адбываецца — сапернік хапае за рукі, ногі, бывае, кусаюць за вушы... Дарэчы, многім спартсменам даводзілася выходзіць на дыван з мікратраўмамі — ад іх не застрахаваны ніхто. Дык вось, калі сапернік, не дай Бог, убачыў, што ў цябе, напрыклад, перабінтаваны палец, то і чакай, што гэты самы палец табе і будуць "выкручваць". Там, як на вайне, бывае, што ўсе сродкі для перамогі добрыя...

— Ну тое, што са спартыўным характарам у цябе ўсё ў парадку, зразумела ўсім. А які Міхаіл Сямёнаў у жыцці?

— Спакойны. Разважлівы. Вельмі чытаць люблю, асабліва гістарычныя кнігі. Гэта ў мяне з дзяцінства, можа, таму і выбраў для паступлення гістфак БДУ. Ва універсітэт я паступіў без праблем. Зараз вучуся на чацвёртым курсе. Вучыцца падабаецца. Ёсць у мяне адзін маленькі недахоп, праўда, я лічу яго сваім здабыткам — люблю паспрачацца, асабліва калі ведаю, што правы. Па жыцці я прытрымліваюся тэзісу аб тым, што менавіта ў спрэчцы нараджаецца ісціна. Яшчэ я не цярплю несправядлівасці, таму і прыходзілася некалькі разоў выкарыстоўваць свае спартыўныя навыкі па-за дываном. Але першым я ніколі не заводжуся...

— Карацей, у выпадку чаго дзяўчыну ад хуліганаў абараніць зможаш...

— Думаю, што змагу. Праўда, у мяне пакуль няма другой палавінкі. Я ў пошуку...

— Якая яна — дзяўчына тваёй мары?

— Адразу скажу, што колер валасоў значэння не мае. Ведаеш, ці то я не шукаю, ці яшчэ што, але сёння знайсці нармальную дзяўчыну справа няпростая. Ты не падумай, што я прыдзіраюся. Для мяне што галоўнае? Галоўнае, каб чалавек, які будзе побач са мной па жыцці, быў мэтанакіраваным. У маёй дзяўчыны павінна быць мэта. Яна павінна працаваць для таго, каб яе ажыццявіць. Да таго ж было б нядрэнна, каб яна не была "пустой". Зараз жа як — у некаторых дзяўчат дыскатэкі, аўтамабілі і шопінг на розуме. А за душой нічога. Мне падабаюцца больш "змястоўныя" людзі — са сваімі перакананнямі, сваімі думкамі, з пачуццём гумару і розумам, начытаныя у рэшце рэшт... І яшчэ ёсць адно "але". Са мной побач ніколі не будзе дзяўчыны, якая паліць...

— І яшчэ нядрэнна было б, каб яна цвікі ў хаце забівала і есці смачна гатавала?

— Ну цвік пры патрэбе я і сам забіць змагу, адрамантаваць нешта... А што да ежы, то далікатэс, можа, і не згатую, але і галодным не застануся... Ты б ведаў, якая ў мяне смачная яечня атрымліваецца — з сырам, памідорам і зелянінай! А ўвогуле, я непераборлівы ў ежы. Ем ўсё — кашы і супы. Усё! Але асабліва налягаю на мяса і сала, вельмі падабаецца, як мама гатуе смажаную курыцу. Нідзе такой не каштаваў...

— Міша, давай усё ж такі вернемся да Алімпіяды. Да яе матэрыяльнага боку. Алімпійскім прызёрам абяцалі прызавыя грошы і паляпшэнне жыллёвых умоў. Што ў цябе на гэты конт?

— Прызавыя ўжо выплацілі ў поўным аб'ёме. На што патрачу? Вельмі хачу купіць машыну. Напэўна, спыню свой выбар на "БМВ". Што да паляпшэння жыллёвых умоў, то гэтае пытанне можа вырашыцца ў снежні. Зараз я жыву ў трохпакаёвай кватэры разам з бацькамі, сястрой, яе мужам і маленькім пляменнікам. Акрамя таго, на нашай жыллёвай плошчы гадуюцца хамяк і папугай...

***

...Не ведаю чаму, але, развітваючыся з Мішам Сямёнавым, я раптам запытаў у яго: "Міша, а дзе медаль алімпійскі?" Спартсмен без усялякай паўзы, не задумваючыся адказаў: "Напішы, што я схаваў і забыўся на яго..." Праз секунду прагучала: "Ну ўсё, я пайшоў, мне ж трэніравацца трэба..."

Дай Бог, каб новая мэта беларускага барца Міхаіла Сямёнава, якую, напэўна, ён акрэсліў для сябе ўжо зараз, здзейснілася праз чатыры гады на Алімпіядзе ў Лондане...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Аўтобус больш не ходзіць

У Мінску закрыліся два аўтобусныя маршруты. Пра гэта паведаміла дзяржаўная ўстанова "Сталічны транспарт і сувязь".

Так, спынілі сваю працу аўтобусныя маршруты №118 "Сухарава-6" — дыспетчарская станцыя (ДС) "Кунцаўшчына" і №151 ДС "Уручча-4" » "Рагачоўская".

Апрача таго, змяніўся аўтобусны маршрут №17 "Сухарава-6" — ДС "Кунцаўшчына". Транспарт будзе хадзіць па вуліцах Кунцаўшчына, Мазурава, Лабанка, Шаранговіча, Акадэміка Фёдарава, Панчанкі.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 08.10.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №